ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 36 (790) | Субота, 2 верасня 1950 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Роднае слова ў школе (перадавы артыкул).
Аркадзь Куляшоў. — Толькі ўперад (урывак з паэмы).
П. Чарных. — Хлеб у імя міру.
І. Шаціла. — Адзіная воля народаў.

Другая старонка.

Я. Цікоцкі. — Вялікі друг совецкай музыкі (да другой гадавіны з дня смерці А. А. Жданава).
Піліп Пестрак. — Павысіць патрабавальнасць да якасці матэрыялаў (часопіс «Беларусь» за першае паўгоддзе 1950 г.).

Трэцяя старонка.

Іван Грамовіч. — Першы раман маладога пісьменніка.
Юр. Васільеў — Палымяны барацьбіт за мір (15 год з дня смерці Анры Барбюса).
А. Іваноў. — Горад запаланіла стыхія таппаў

Чацвертая старонка.

Г. Цітовіч. — Запольскія песняры.
Ю. Нікалаеў. — Дыскрымінацыя славян у ЗША.
«Беларусь» № 8.

Роднае слова ў школе

Хто не памятае шчаслівых дзён маленства, калі ён упершыню сеў за школьную парту і перад ім са слоў настаўніка і з падручнікаў для чытання, у якіх сабраны лепшыя ўзоры мастацкага слова, пачало адкрывацца багацце роднай мовы і літаратуры! Мастацкія творы, якія палюбілі мы ў школе, застаюцца назаўсёды ў памяці. Яны ўзбагацілі нашы веды, засталіся спадарожнікамі жыцця. Роднае мастацкае слова абуджае любоў да сваёй Радзімы, да свайго народа, служыць дзейсным сродкам выхавання маладога пакалення ў духу адданасці большэвіцкай партыі, вялікім ідэям Леніна—Сталіна.

Мастацкая літаратура адыгрывае выключную ролю ў фармаванні светапогляду моладзі.

«Неабходна ведаць рускую літаратуру і ў асаблівасці мастацкую, — гаварыў Міхаіл Іванавіч Калінін. — ...У мастацкай літаратуры вы бачыце людскія тыпы ў бясконца разнастайных становішчах. Таму павышэнне культуры — гэта ў першую чаргу веданне мастацкай літаратуры. Яна больш за ўсё ўзбагачае чалавека, дае магчымасць (я мяркую па сваім вопыце) расці чалавеку, больш разумець людзей».

Тое-ж можна сказаць і аб беларускай совецкай літаратуры і аб літаратурах другіх братніх совецкіх народаў.

Беларускія пісьменнікі, як і пісьменнікі ўсёй нашай Радзімы, за апошнія гады дамагліся значных поспехаў. Толькі за пасляваенны час творчасць беларускіх пісьменнікаў адзначана пяццю Сталінскімі прэміямі. Штогод з друку выходзяць дзесяткі кніг паэзіі, прозы і драматургіі, выдаюцца літаратурныя часопісы і газеты.

Большэвіцкая партыя і Совецкі ўрад праяўляюць выключныя клопаты аб духоўным росквіце нашага народа. І як вынік гэтых клопатаў, мы маем новы небывалы ўздым развіцця літаратуры, мовы і мастацтва.

Друкуючы свае творы, совецкі пісьменнік у першую чаргу думае, якую ролю адыграе яго твор у совецкім грамадстве, якое яго выхаваўчае значэнне, што новае ён раскажа аб жыцці і працы совецкага чалавека. Усё безыдэйнае і нізкаякаснае сустракае самае рэзкае і справядлівае асуджэнне з боку чытача, совецкай грамадскасці.

Калі такія высокія патрабаванні прад'яўляюцца да мастацкіх кніг, дык не меншыя патрабаванні мы павінны прад'яўляць да кнігі кніг — да школьнай хрэстаматыі і падручніка, па якіх выхоўваецца ў школе наша маладое пакаленне.

Нельга сказаць, што ў справе стварэння хрэстаматый па літаратуры і падручнікаў, у складанні праграм па літаратуры і мове, у нас нічога не зроблена. У гэтай справе за апошні час мы маем значныя поспехі.

Калектыў крытыкаў і літаратуразнаўцаў пры дапамозе Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі навук БССР стварыў падручнік па гісторыі беларускай літаратуры для восьмага класа і падручнік па совецкай літаратуры для дзевятага і дзесятага класаў сярэдняй школы. Рыхтуецца падручнік па літаратуры для вышэйшых навучальных устаноў. Карэнным чынам перароблены і перавыдадзены кнігі для чытання і хрэстаматыі па роднай літаратуры для пачатковай і няпоўнай сярэдняй школы.

У новых падручніках для сярэдняй школы знайшлі адлюстраванне лепшыя дасягненні беларускай совецкай літаратуры. Шырока прадстаўлена творчасць класікаў беларускай літаратуры — Янкі Купалы і Якуба Коласа, вядомых нашых пісьменнікаў — Кузьмы Чорнага, Змітрака Бядулі, Эдуарда Самуйлёнка, Паўлюка Труса, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Міхася Лынькова, Максіма Танка, Пятра Глебкі і іншых.

Аднак, ці адлюстроўваюць школьныя хрэстаматыі і падручнікі ўсё багацце беларускага мастацкага слова, ці задавальняюць яны поўнасцю запатрабаванням часу, ці зрабіліся яны сапраўды неразлучнымі любімымі кнігамі нашай школьнай дзетвары?

На жаль, пісьменнікі і выкладчыкі, бацькі і дзеці могуць яшчэ прад'явіць да падручнікаў значныя патрабаванні.

Школьныя падручнікі яшчэ носяць адзнакі няўдумлівасці, фармальнага падыходу да складання іх, адзнакі таго, што Ул. Маякоўскі назваў «хрэстаматыйным глянцам». Ёсць беззмястоўнасць, прымітыў і нават звычайны бяздушны фармалізм.

У падручнікі ўключаюцца, як вядома, лепшыя творы пісьменнікаў, якія заўсёды чытаеш і перачытваеш са здавальненнем. Але вось тыя камянтарыі і заўвагі, якія суправаджаюць творы, падчас выклікаюць і ў настаўніка і ў вучня не толькі здзіўленне, а і недаўменне. Напрыклад, у кнізе для чытання ў чацвертым класе, на старонцы 168, чытаем: «... вясной 1905 года Купала прынёс свой першы верш «Мужык» у рэдакцыю рускай газеты «Северо-западный край», якая выходзіла ў Мінску. Паноў, якія працавалі ў гэтай рэдакцыі, здзівіла, што верш быў напісаны на беларускай мове. Яны-ж добра ведалі, што друкаваць творы на беларускай мове было забаронена. Яшчэ больш іх здзівіў змест верша... Але паколькі ў гэты час разгарнуліся рэвалюцыйныя падзеі, дык паны з рэдакцыі вымушаны былі верш Купалы надрукаваць».

Ігнаруючы гістарычную праўду, аўтар гэтага сцверджання дэзарыентуе чытача, падае факт надрукавання першага верша Я. Купалы ў крывым люстры.

Вядома, што газета «Северо-западный край» адыграла ў Беларусі значную прагрэсіўную ролю. На чале яе стаялі соцыял-дэмакраты, якія ў перыяд 1905 года зрабілі яе рупарам соцыялістычных ідэй. І гарачая падтрымка рэвалюцыйнага твора беларускага паэта гэтай газетай была невыпадковай з'явай, а выцякала арганічна з палітычнай праграмы рэдакцыі і яе супрацоўнікаў.

Фармальна падыйшлі ўкладчыкі хрэстаматыі да падачы біяграфічных звестак і характарыстыкі творчасці народнага паэта. У хрэстаматыях для пятага і шостага класаў слова ў слова, абзац у абзац паўтараюцца адны і тыя-ж павярхоўныя звесткі аб жыцці і творчасці Янкі Купалы. Падобная-ж з'ява фармальнага, чыноўніцкага падыходу да асвятлення літаратурных з'яў ёсць і ў падручніках для сёмага класа. Там поўнасцю без усялякіх паправак перапісваюцца раздзелы аб фальклоры. Прычым звесткі, якія, відаць, лічацца аўтарам непаграшымымі, вельмі павярхоўныя і даюць збедненае ўяўленне аб багацці беларускага фальклора. А хіба-ж аўтары хрэстаматый не маглі-б знайсці жывога, сапраўды мастацкага слова, каб расказаць дзецям аб багатай вуснай творчасці беларускага народа? У падручніку сустракаецца таксама шмат хібаў моўнага і стылявога парадку.

Трэба сказаць, што па свайму зместу, па выбару матэрыяла хрэстаматыі яшчэ не адлюстроўваюць усяго багацця нашай літаратуры. У іх падчас трапляюць творы у скарочаным і скажоным выглядзе. А многія тэмы нашай літаратуры атрымалі зусім недастатковае асвятленне. У праграмах і хрэстаматыях амаль адсутнічаюць творы аб рэвалюцыйнай барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі, мала твораў аб высокародным вобліку совецкага чалавека ў часе Вялікай Айчыннай вайны. Неабходна змясціць больш твораў аб мірнай стваральнай працы совецкіх людзей. Недастатковае ўяўленне даецца і аб лепшых дасягненнях літаратур братніх народаў. Аўтары падручнікаў яшчэ мала звяртаюць увагі на выхаванне мастацкага густу дзяцей.

У кнізе для чытання ў трэцім класе падаюцца яўна няўдалыя вершаваныя радкі з надуманымі вобразамі:

Жыта буйна каласіцца,
Нахіляецца чалом,
Ячмені, аўсы, пшаніцы
Зашумелі кажухом.

Не толькі дзеці, а і сам настаўнік наўрад ці здолеюць растлумачыць гэтыя «выразы з пераносным значэннем», як гэтага патрабуюць аўтары падручнікаў.

Школьны падручнік не церпіць блытаніны, нічога недакладнага і антынавуковага, не церпіць павярхоўнасці. Ён патрабуе дакладнасці стылю і мовы, каб роднае слова сапраўды гучала ўсёй сваёй паэтычнай прыгажосцю.

Мы маем усе магчымасці даць школе высокаякасныя падручнікі і палепшыць справу вывучэння роднай мовы і літаратуры. А для гэтага неабходна вялікая і сур'ёзная работа Міністэрства асветы БССР, нашых настаўнікаў, пісьменнікаў і Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Міністэрства асветы павінна быць больш патрабавальным да аўтараў падручнікаў і ўкладальнікаў хрэстаматый. Настаўнікі могуць унесці шмат каштоўнага ў справу адбору літаратурнага матэрыяла, складання тлумачальных тэкстаў, распрацоўкі метадыкі выкладання. Дзяржаўнаму выдавецтву БССР неабходна ўлічыць патрабаванні настаўнікаў і выдаваць масавым тыражом серыю кніг для пазашкольнага чытання. Неабходна палепшыць таксама і мастацкае афармленне падручнікаў.

Толькі пры дапамозе ўсёй совецкай грамадскасці мы здолеем палепшыць справу выкладання літаратуры ў школе, выканаць адказныя і пачэсныя задачы комуністычнага выхавання маладога пакалення совецкіх людзей.

Аркадзь КУЛЯШОЎ.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Толькі ўперад

Аркадзь Куляшоў напісаў новую паэму пад назвай «Толькі ўперад»— аб пакаленні совецкіх людзей, выхаваных комсамолам і партыяй, аб тых суровых выпрабаваннях, якія ім давялося прайсці ў барацьбе за соцыялізм, аб іх працы, дружбе і каханні.

Асноўны герой паэмы Алесь пасля Вялікай Айчыннай вайны вяртаецца ў родныя мясціны, каб сустрэцца з дзяўчынай, якую кахае. Ен дазнаецца, што яна гераічна загінула ў баях з фашысцкімі акупантамі, будучы ў партызанскім атрадзе.

Ніжэй друкуем заключныя раздзелы паэмы.

* * *

Сёння полем, дзе быў
партызанскі раён,
Самаходны камбайн
гоніць жытні загон.
На камбайне дзяўчына
жне жыта з відна.
У такой, як Алеся,
касынцы яна.
У чырвонай касынцы,
прыкметнай здалёк,
На грудзях — баявы
комсамольскі значок.
Славіць песняй сваёй
у палях залатых
І загінуўшых справы
і справы жывых.
А з капніцеля,
ды на ўвесь край на лясны,
Пасабляюць ёй пецьь
хлапчукі-таптуны.
Грузавік пад'язджае,
ідзе бок у бок.
Ускідае камбайн,
адчыніўшы латок,
На яго свой цяжар —
поўны бункер зярнят,
Нібы дзядзьку на плечы,
пудоў шэсцьдзесят.
Грузавік, як жывы,
уздыхае, сапе,
І, падкінуўшы ношу,
нясе на сабе.
На камбайне сяджу
за шчытком ветраным.
Жыта боль заказлыхвае
шумам марскім.
Закалыхвае боль,
закалыхвае жаль.
А дзяўчына вядзе
карабель свой між хваль,
Карабель свой вядзе
ў залацістую даль.
Разам з ёй слаўлю песняй
разумную сталь.
Слаўлю мірную сталь СССР,
па якой
Льюцца ў бункер зярняты
шумлівай ракой.

Праклінаю германскую сталь,
па якой
Тут нядаўна кроў наша
лілася ракой.
Праклінаю Амерыкі сталь,
па якой
Кроў карэйскіх сыноў
льецца сёння ракой.
Праклінаю сталь смерці,
што косіць, не жне,
Сталь, якую ўвесь свет
сёння гучна кляне.
. . . .
Карабель наш магутны
нырае між хваль.
Слаўлю сталь СССР,
слаўлю Сталіна сталь!

* * *

Не наведаць не мог
я таго кургана,
Дзе сябрамі ў вайну
пахавана яна.
Пад густым, пад зялёным
сасновым шатром —
Помнік з дошчак
і фота ў акенцы за шклом,
А ні сонцам не кранутае,
ні дажджом.
Як жывая — глядзіць
на лугі, на раку,
У кубанцы мужчынскай,
у кажушку, —
Просты,
поўны рашучае сілы пагляд,
Лента цераз плячо,
на грудзях аўтамат —
Рэволюцыі
непераможны салдат.
І, —
без гэтага быў-бы не поўны
партрэт,—
Знаю: пад кажушком,
захаваны, як след,
Каля самага сэрца —
партыйны білет.
А навокал жывыя вянкі —
колькі іх? —
З кветак розных: лясных,
лугавых, палявых,
Акуратна пакладзеныя
на траву...
Я ў жалобе схіляю
сваю галаву.
Потым, вокам акінуўшы
ціхі курган,
Гавару я ад імені
тых партызан,
Што хавалі яе,
ад сяброў баявых,
Што былі тут
і што не былі — ад усіх,
З кім ішла яна шляхам адзіным,
ад тых,
Што цяпер адбудоўваюць
родны свой край:
— Спі спакойна, таварыш.
Ідзем мы. Бывай.
Мы з твайго пакалення,
Усе — змагары,
Мы свет новы будуем,
Руйнуем стары.
Мы ідзем. Яшчэ ў нас
Неадпомшчаных шмат.
Сярод іх — ты, наш друг, —
Рана паўшы салдат.
Мы не хілім галоў,
Шчыльна стаўшы ў рады.
У смяротныя бітвы
Вадзіла заўжды
Нас не толькі нянавісць,
Вадзіла любоў
Да Радзімы, да працы,
Да нашых сяброў.
І сягоння вядзе нас
Наперад ізноў
Прага працы, любоў,
Наша юная кроў.
Пакаленне, з якім
Выраслі мы ўсе,
Сёння ў свеце
Галоўную службу нясе.
Шмат яшчэ перашкод
І нягод на пуці.
Трэба ўперад ісці,
Толькі ўперад ісці.
. . . .
Бесядзь я перайшоў.
Просіць сэрца дарог.
Быццам пераступіў я
бацькоўскі парог,
Як марак,
што спяшаецца на параход,
Як пілот,
што спяшаецца на самалёт,
Як камбайнер,
які выязджае ў палі,
Як салдат, што ў суровы
выходзіць паход,
У змаганне за шчасце
і мір на зямлі... —
Як марак, як пілот,
як камбайнер, салдат.
Толькі ўперад і ўперад,
ні кроку назад!

ХЛЕБ У ІМЯ МІРУ

З раніцы да вечара на калгасных таках бесперапынна гудуць малатарні. Дзень і ноч на пункты «Заготзярно» па прасёлачных дарогах і шашы рухаюцца падводы, нагружаныя збожжам новага ўраджаю.

Калгаснікі Скідэльскай раўніны свята выконваюць першую запаведзь перад любімай Радзімай — датэрмінова разлічваюцца з дзяржавай па пастаўках хлеба.

У гэтым годзе на Луннёнскім глыбінным падпункце Скідэльскага аддзялення «Заготзярно» першы квіток атрымаў калгас «Новае жыццё».

— Хлеб міру! — прымаючы жыта новага ўраджаю, гаворыць загадчык склада Аляксандр Рамашка.

— Так, гэта — хлеб міру! — пацвярджае старшыня перадавой сельгасарцелі «30 год Кастрычніка» комуніст Яўгені Глод.

Калгасны важак, прывітаўшыся з начальнікам палітаддзела МТС Скобелевым, расказвае аб стане спраў у калгасе.

— Прыбралі, абмалацілі і з дзяржавай разлічыліся ў тэрмін. Дзякуй за камбайн, — сорак пяць гектараў скасіў.

— Гаворань, абмалачвае не чыста, — уступае ў размову нізенькі хударлявы селянін у шэрай світцы.

— А ты адкуль будзеш, чалавеча?

— Гэта мой стары знаёмы, — усміхнуўся Скобелеў. — Пятро Каржэцкі з вёскі Машталеры. Апошні аднаасобнік у сваёй вёсцы.

— Яно і відаць, — сур'ёзна сказаў Глод. — «Абмалачвае не чыста», чулі? Спярша вось так пра трактары хлусілі: пры трактарным ворыве хлеб газай пахне...

— Дарэмна вы накінуліся на чалавека, таварыш Глод, — усміхнуўся начальнік палітаддзела. — Пятро падаў заяву ў калгас, сёння прымаць будзем.

У абкружэнні калгаснікаў з прынёманскіх сельгасарцелей Пятро стаіць каля паўтаратонкі, радыятар якой упрыгожаны чырвоным сцяжком. Маладзенькая лабарантка ў белым хвартуху і сіняй касынцы з дапамогаю прыбораў вызначае якасць збожжа.

— Вільготнасць пятнаццаць, — запісвае яна.

— Тысяча шэсцьсот дваццаць тры кілаграмы, — абвяшчае вагаўшчык.

— Добра,—задаволена гаворыць Глод.— План выкананы.

— А колькі, прыкладна, з гектара знялі? — не стрымаўся ізноў Пятро Каржэцкі.

— У сярэднім па пятнаццаць цэнтнераў. На асобных участках — дваццаць.

Пятро ўздыхае.

— А я нажаў па дзве капы без дванаццаці снапоў. А ўсяго намалаціў два цэнтнеры. Вось, значыць, якая арыфметыка атрымліваецца, — узрушана разводзіць ён рукамі.

... Падводы і аўтамашыны ідуць адна за другой. У чаканні чаргі калгаснікі маладых прынёманскіх калгасаў ажыўлена гавораць аб апошніх навінах, абменьваюцца думкамі аб прадстаячых справах.

Дзяржаўныя засекі з кожным часам напаўняюцца хлебам. Гэта — хлеб новага ўраджаю, уклад маладых калгаснікаў Скідэльскай раўніны ў справу міру.

П. ЧАРНЫХ.
(Наш кар.).

Мястэчка Лунна,
Скідэльскага раёна.

Адзіная воля народаў

Амерыканскія інтэрвенты па-зверску забіваюць тысячы мірных жыхароў Карэі, падвяргаюць варварскім бамбардыроўкам мірныя гарады і сёлы, знішчаюць дзяцей, жанчын, старых.

Усе сумленныя людзі патрабуюць неадкладнага спынення амерыканскай агрэсіі, спынення зверскіх бамбардыровак мірнага карэйскага насельніцтва.

Народы патрабуюць міру. Рух за мір пашыраецца з кожным днём. Сотні мільёнаў людзей ва ўсіх краінах паставілі ўжо свае подпісы пад Стакгольмскай Адозвай аб забароне атамнай зброі.

Народы свету не жадаюць вайны!

Спяганосцам міру з'яўляюцца грамадзяне нашай краіны. Звыш 115 мільёнаў совецкіх людзей паставілі свае подпісы пад Адозвай.

Стакгольмскую Адозву я падпісаў, калі наш тэатр знаходзіўся на гастролях у Харкаве. Мы бачылі квітнеючую Украіну, якая будуе свае гарады і сёлы, заводы і фабрыкі. Мы бачылі цудоўныя скверы і паркі, светлыя палацы культуры, пабудаваныя пасля вайны.

Увесь совецкі народ заняты мірнай стваральнай працай.

А сучасныя канібалы спрабуюць уцягнуць чалавецтва ў новую вайну.

Гэтаму не бываць!

Работнікі мастацтва, дзе-б яны ні знаходзіліся, сваёй працай таксама ўмацоўваюць справу міру. Творы совецкага мастацтва, якія выкрываюць падпальшчыкаў новай вайны і паказваюць рост прагрэсіўных сіл свету, успрымаюцца з асаблівым уздымам.

Спектакль «Голас Амерыкі» Б. Лаўранёва, пастаўлены на сцэне тэатра імя Янкі Купалы, расказвае аб лёсе амерыканца Вальтэра Кіда, які перайшоў у лагер барацьбітоў супроць падпальшчыкаў вайны.

Мне давялося працаваць над вобразам Кіда. Гэта сумленны амерыканскі афіцэр, які глыбока любіць сваю радзіму. Кід бачыў рускіх салдат на полі бітвы і пераканаўся ў высакародстве і самаадданасці рускага народа. Шлях барацьбы з імперыялістычнай рэакцыяй, шлях барацьбы за мір—вось той шлях, на які становіцца Вальтэр Кід.

Сустрэча з комуністам Макданальдам канчаткова пераконвае яго ў правільнасці выбранага шляху. Толькі комуністы ўказваюць усім сумленным людзям рэальныя сродкі барацьбы супроць падпальшчыкаў новай вайны. «За мір, за новую Амерыку мы будзем стаяць насмерць!»,—вось словы сумленнага чалавека.

І гэтай ідэяй жывуць усе міралюбівыя людзі свету. Мір пераможа вайну!

І. ШАЦІЛА,
заслужаны артыст БССР.

Новыя песні

Рэпертуарная камісія Беларускага камітэта радыёінфармацыі прыняла да выканання новыя песні: студэнта IV курса кансерваторыі І. Кузняцова «Мір свету» на тэкст К. Пуроўскага, Р. Пукста «Мір пераможа вайну» на тэкст А. Бачылы, М. Чуркіна «Мінску — слава!» на тэкст М. Гамолкі, хор Я. Цікоцкага «Міру абаронцы» на тэкст Эдзі Агняцвет, А. Камінскага «Мірны наш шлях» на словы М. Васілька, Л. Абеліёвіча «Песні міру» на тэкст П. Барэйкі.

Конкурс мастацкага чытання

У Гомелі адбыўся конкурс на лепшае выкананне твораў совецкіх пісьменнікаў аб міру. Конкурс арганізаваны абласным Домам народнай творчасці і праўленнем клуба імя Леніна Беларускай чыгункі.

Удзельнікі конкурса — студэнты вышэйшых навучальных устаноў, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі прачыталі творы на тэмы міру К. Сіманава, С. Міхалкова, А. Суркова, М. Луконіна, А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка і А. Пысіна.

Актыўны ўдзел у конкурсе прынялі члены літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі газеты «Гомельская праўда».

Лепшыя выканаўцы атрымалі каштоўныя падарункі.

Пісьменнікі перад мікрафонам

Літаратурна-драматычны аддзел Беларускага камітэта радыёінфармацыі пры Совеце Міністраў БССР сістэматычна перадае літаратурна-музычныя кампазіцыі, выступленні пісьменнікаў і дзеячоў мастацтва, прысвечаныя тэме барацьбы за мір.

За жнівень былі арганізаваны наступныя радыёперадачы: «На вахце міру», выступленні дзеячоў літаратуры і мастацтва ў абарону міру, «Совецкі Саюз сцяганосец міру», «Анры Барбюс—барацьбіт за мір», «Беларусь мірнай працай сваёй ганарыцца» і іншыя.

У перадачах прынялі ўдзел: народны паэт Я. Колас, пісьменнікі П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, У. Краўчанка, К. Кірэенка, А. Вялюгін, Р. Няхай, М. Гамолка, П. Прыходзька, Ул. Кулакоў, П. Пранузa, А. Стаxер.

Вялікі друг совецкай музыкі

(Да другой гадавіны з дня смерці А. А. ЖДАНАВА)

Цяжка пераацаніць тыя вялікія ідэі і думкі, якія выказаў у свой час аб развіцці совецкай музыкі Андрэй Аляксандравіч Жданаў. З кожным годам усё вышэй паўстае перад намі яго веліч і кіруючая роля ў развіцці совецкай музыкі. У сваіх выказваннях на нарадзе дзеячоў совецкай музыкі ў ЦК ВКП(б) у 1948 г. А. Жданаў з гранічнай выразнасцю вызначыў галоўны шлях развіцця совецкай музыкі. Выказванні А. Жданава заснаваны на ўсебаковым веданні і глыбокім аналізе стану ўсіх жанраў совецкай музыкі і на дэталёвым вывучэнні работ выдатных тэарэтыкаў і ідэолагаў рускай класічнай музыкі — Стасава, Сярова, выказванняў найвялікшых рускіх кампазітараў—Глінкі і Чайкоўскага. З велізарным веданнем справы А. Жданаў выказвае свае думкі аб адносінах да класічнай спадчыны, аб глыбокай сувязі кампазітараў-класікаў з народам, аб праграмнай музыцы, наватарстве і г. д. Асаблівую ўвагу надаваў таварыш Жданаў барацьбе двух супроцьлеглых напрамкаў, якія мелі месца тады ў совецкай музыцы. Характарызуючы іх, таварыш Жданаў пісаў:

«Адзін напрамак прадстаўляе здаровы, прагрэсіўны пачатак у совецкай музыцы, грунтуецца на прызнанні велізарнай ролі класічнай спадчыны, і, у прыватнасці, традыцый рускай музычнай школы, на спалучэнні высокай ідэйнасці і змястоўнасці музыкі, яе праўдзівасці і рэалістычнасці, глыбокай, арганічнай сувязі з народам, з яго музычнай, песеннай творчасцю, у спалучэнні з высокім прафесійным майстэрствам. Другі напрамак выражае варожы совецкаму мастацтву фармалізм, адмаўленне пад сцягам уяўнага наватарства ад класічнай спадчыны, адмаўленне ад народнасці музыкі, ад служэння народу ва ўгоду абслугоўванню сугуба індывідуалістычных перажыванняў невялікай групы заўзятых эстэтаў.

Гэты напрамак ажыццяўляе замену натуральнай, прыгожай, чалавечай музыкі музыкай фальшывай, вульгарнай, вельмі часта проста паталагічнай».

Вычарпальную характарыстыку дае далей таварыш Жданаў класічнай музыцы, гаворачы, што для класічнай музыкі характэрны праўдзівасць і рэалізм, уменне дасягаць адзінства выдатнай мастацкай формы і глыбокага зместу, спалучаць найвышэйшае майстэрства з прастатой і даступнасцю. Класічнай музыцы наогул, рускай класічнай музыцы ў асаблівасці, варожы фармалізм і грубы натуралізм.

А. Жданаў даў рэзкую ацэнку натуралістычным скажэнням у музыцы, частым выпадкам «беспардоннага захаплення вульгарным натуралізмам».

«Трэба сказаць прама, што цэлы рад твораў сучасных кампазітараў настолькі перанасычаны натуралістычнымі гукамі, што напамінае, прабачайце за нязграбны выраз, не то бормашыну, не то музычную душагубку».

Вядома, што фармалісты ў музыцы схільны былі атаесамляць незразумелае з геніяльным, але А. Жданаў ушчэнт знішчыў фармалісцкі «крытэрый» геніяльнасці:

«... Музычны твор тым больш геніяльны, чым ён больш змястоўны і больш глыбокі, чым ён больш высокі па майстэрству, чым большай колькасцю людзей ён прызнаецца, чым большую колькасць людзей здольны натхніць. Не ўсё даступнае геніяльна, але ўсё сапраўды геніяльнае даступна, і яно тым больш геніяльнае, чым яно больш даступнае для шырокіх мас народа».

А музыку «грубую, нязграбную, вульгарную, заснаваную на атанальнасцях, на суцэльных дысанансах» А. Жданаў параўноўвае з кубізмам і футурызмам у жывапісу, адзначаючы, што, як першае «пагражае ліквідацыяй музыкі», так другое з'яўляецца ўстаноўкай «на разбурэнне жывапісу». З высокай большэвіцкай палымянасцю таварыш Жданаў выступаў не толькі супроць пагрозы ліквідацыі музыкі, але і за разнастайнасць яе жанраў, якія былі забыты многімі совецкімі кампазітарамі.

«Якімі былі добрымі і шчодрымі вялікія майстры мастацтва ў адносінах разнастайнасці жанраў!» — нагадаў таварыш Жданаў і тут-жа з дакорам звярнуўся да кампазітараў-фармалістаў:



А. А. Жданаў.
Работа скульптара З. Азгура.

«Чаму вы так не падобны да сваіх вялікіх продкаў? Вы значна больш чорствыя, чым тыя, хто, займаючы вышыні мастацтва, пісаў для народа песенную сольную, харавую і аркестровую музыку». А. А. Жданаў гаворыць аб неабходнасці гарманічнага спалучэння ўсіх элементаў музыкі — мялодыі, пявучасці, рытма.

Нарэшце А. А. Жданаў ставіць перад совецкімі кампазітарамі кардынальную задачу:

«Трэба аднавіць у поўнай меры значэнне класічнай спадчыны, трэба аднавіць нармальную чалавечую музыку. Трэба падкрэсліць небяспеку ліквідацыі музыкі, якая пагражае ёй з боку фармалістычнага напрамку, і асудзіць гэты напрамак як герастратаву спробу разбурыць храм мастацтва, створаны вялікімі майстрамі музычнай культуры. Трэба, каб усе нашы кампазітары перабудаваліся і навярнуліся тварам да свайго народа. Трэба, каб усе ўявілі сабе тое, што наша партыя, выяўляючы інтарэсы нашай дзяржавы, нашага народа, будзе падтрымліваць толькі здаровы, прагрэсіўны напрамак у музыцы, напрамак совецкага соцыялістычнага рэалізма».

Як вядома, вывады, зробленыя таварышам Жданавым на нарадзе, знайшлі поўнае адлюстраванне ў Пастанове ЦК ВКП(б) аб оперы «Вялікая дружба» В. Мурадэлі.

З гордасцю напамінаючы, што СССР з'яўляецца ўзорам чалавечай цывілізацыі і культуры, А. А. Жданаў заклікае совецкіх кампазітараў да барацьбы з буржуазнымі ўплывамі з-за мяжы, а для гэтага «не толькі музычнае, але і палітычнае вуха совецкіх кампазітараў павінна быць вельмі чулым», а «сувязь з народам павінна быць як ніколі шчыльнай».

Выказванні таварыша Жданава па пытаннях музычнай творчасці з'яўляюцца ўзорам прынцыповай большэвіцкай музычнай крытыкі. Бясспрэчна іх велізарнае станоўчае значэнне для ўсяго ходу развіцця совецкай музычнай культуры, для перабудовы ўсёй арганізацыйнай і творчай работы Саюза совецкіх кампазітараў. Яны сталі баявой ідэйна-творчай праграмай для ўсіх совецкіх кампазітараў. Партыйныя ўстаноўкі па пытаннях музычнага мастацтва, аўтарытэтная партыйная крытыка заўсёды дапамагала і дапамагае совецкім кампазітарам ісці ў сваёй творчасці па правільнаму рэалістычнаму шляху. Не выпадкова 14 год таму назад кампазітар Д. Шастаковіч пасля крытычных артыкулаў «Правды» супроць фармалізма ў музыцы стварыў сваю найбольш папулярную 5-ю сімфонію, а цяпер, пасля гістарычнай Пастановы ЦК ВКП(б) ад 10 лютага 1948 года, стварыў такія рэалістычныя творы, як манумянтальная араторыя «Песня аб лясах» —аб грандыёзным сталінскім плане пераўтварэння прыроды нашай Радзімы—і музыку да кінофільма «Падзенне Бярліна». Не выпадкова таксама, што Сталінскіх прэмій за той-жа год удастоены і творы некаторых іншых кампазітараў, якім партыя дапамагла пазбавіцца ад фармалістычных памылак, як Н. Мяскоўскі — за санату для віяланчэлі і фартэпіяна і А. Хачатуран — за музыку да кінофільма «Сталінградская бітва». Усё гэта — вынік велізарных клопатаў партыі і ў прыватнасці А. А. Жданава аб развіцці музычнага мастацтва совецкіх народаў.

У поўнай меры спраўджваюцца заключныя словы з выступлення таварыша Жданава на нарадзе дзеячоў совецкай музыкі ў ЦК ВКП(б), яго палымяны заклін да совецкіх кампазітараў:

«Таварышы, мы хочам, мы горача жадаем, каб у нас была свая «магутная кучка», каб яна была і шматлікай і больш моцнай, чым тая, якая калісьці здзіўляла свет сваімі талентамі і ўславіла наш народ... Калі вы выкарыстаеце да дна геніяльную класічную музычную спадчыну і разам з тым разаўеце яе ў духу новых патрабаванняў нашай вялікай эпохі, вы станеце совецкай «магутнай кучкай». Мы хочам, каб адставанне, якое вы перажываеце, як мага хутчэй было пераадолена, каб вы хутчэй перабудаваліся і ператварыліся ў слаўную кагорту совецкіх кампазітараў, якія з'яўляюцца гордасцю ўсяго совецкага народа».

Совецкія кампазітары заўсёды з удзячнасцю ўспамінаюць імя А. А. Жданава — саратніка вялікага Сталіна.

Цяпер, у перыяд перабудовы творчай і арганізацыйнай работы беларускай кампазітарскай арганізацыі, указанні таварыша Жданава дапамагаюць беларускім кампазітарам у стварэнні новых твораў рэалістычнага народнага напрамку ва ўсіх жанрах.

Я. ЦІКОЦКІ,
кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Павысіць патрабавальнасць да якасці матэрыялаў

(Часопіс „Беларусь“ за першае паўгоддзе 1950 г.)

◆
Піліп ПЕСТРАК
◆

Кожны нумар часопіса «Беларусь» пачынаецца перадавым палітычным артыкулам на тую ці іншую тэму. Апрача гэтага, у часопісу друкуюцца артыкулы палітычнага характару на спецыяльныя тэмы. Гэта гаворыць аб правільным напрамку часопіса, аб немалой колькасці ў ім публіцыстычнага матэрыялу. Іншая справа, — ці дастаткова гэта. Нам здаецца, што недастаткова. Нам здаецца яшчэ і тое, што ў гэтым напрамку ў рэдакцыі часопіса мала планавасці, не ўсё як след прадумваецца.

За паўгоддзе ў часопісу «Беларусь» надрукавана каля дзесяці падобных артыкулаў. Большасць з іх не на такой вышыні, як-бы хацелася. Асноўная іх загана ў тым, што яны напісаны даволі суха. Няма ці недастаткова ў артыкулах таго, што можна было-б назваць «творчым агнём».

Той-жа недахоп назіраецца і ў артыкулах на спецыяльныя тэмы. Напрыклад, артыкул І. Чарняўскага «Перавага калгаснага ладу» («Беларусь» № 1), які прызначаны для працоўных заходніх абласцей рэспублікі, напісаны недастаткова папулярна. Правільныя палажэнні аб перавазе калгаснага ладу над індывідуальнай сельскай гаспадаркай не праілюстраваны канкрэтнымі прыкладамі з жыцця. У артыкуле ёсць і адна няправільная фраза: «Беларускі народ, і ў тым ліку прапоўнае сялянства, быў вызвалены ад нацыянальнага прыгнёту...» (стар. 9). Каго аўтар лічыць народам, калі далучае да яго «працоўнае сялянства»? Як вядома, сялянства таксама народ.

Сярод артыкулаў на спецыяльныя тэмы трапляюцца і такія, якія робяць уражанне, што яны склеены з цытат (артыкул І. Росмана — «Ленінізм — сцяг барацьбы за перамогу комунізма», «Беларусь» № 1).

З артыкулаў, надрукаваных за паўгоддзе, вылучаюцца наступныя: Г. Якуба — «Выдатная зброя інтэрнацыянальнага выхавання працоўных» (аб кнізе І. В. Сталіна «Марксізм і нацыянальнае пытанне», «Беларусь» № 3), В. Сцяпанава — «Ленінская тэорыя адлюстравання» («Беларусь» № 4), І. Лакіна — «М. І. Калінін аб комуністычным выхаванні працоўных». («Беларусь» № 6). Да іх трэба далучыць і артыкул П. Броўкі — «Вышэй ўзровень літаратурнай крытыкі» («Беларусь» № 6), Г. Шчарбатава — «Магутная зброя большэвіцкай партыі» (аб газеце «Правда» — «Беларусь» № 5).

У названых артыкулах відаць веданне аўтарамі прадмета, сістэматычнасць і паслядоўнасць у выкладанні думак. Толькі артыкулу П. Броўкі нехапае аналіза прычын адставання нашай літаратурнай крытыкі. Артыкул Г. Шчарбатава мае аднакі пратакольнасці.

Асобна трэба сказаць пра артыкул П. Ліпілы і М. Шкляра аб кнізе Л. Ф. Цанавы «Усенародная партызанская вайна на Беларусі супроць фашысцкіх захопнікаў» («Беларусь» № 6). Артыкул гэты вельмі слабы. Аўтары абмяжоўваюцца толькі пераказам зместу кнігі.

Трэба таксама адзначыць добрыя артыкулы Ф. Андросіка «Аднаўленне і развіццё гарадоў БССР» («Беларусь» № 2) і А. Лапо пра Мічурына — «Выдатны вучоны і пераўтваральнік прыроды» («Беларусь» № 6). Пажадана было-б мець больш падобных артыкулаў.

Вельмі слабы, павярхоўны артыкул пад гучным і агульным загалоўкам «Культура працоўных заходніх абласцей рэспублікі» Б. Пяркоўскага («Беларусь» № 5). У ім ні слова не сказана аб барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі супроць белапольскай акупацыі. Сказана толькі, што там не было ні школ, ні тэатраў, ні бібліятэк. Так, правільна — там гэтых устаноў не было. А тое, што народ змагаўся праз увесь час акупацыі за гэтыя ўстановы нароўні з барацьбой за зямлю, за ўз'яднанне — гэта факт, міма якога, зразумела, нельга прайсці.

Усё большае і большае месца пачалі займаць у часопісу нарысы. Трэба адзначыць, што ў гэтым надзённым і вельмі патрэбным жанры прыкметна палепшанне. За паўгоддзе ў часопісу «Беларусь» надрукавана звыш 10 нарысаў. З іх толькі два на індустрыяльную тэму: «Заслонаўцы» І. Козіка (№ 2) і «Здзейсненая мара» А. Нікалаева — аб стаханаўцах Віцебскага завода заточных станкоў (№ 5). Але гэтыя нарысы ў мастацкіх адносінах слабыя. Аўтары іх губляюцца ў дробязях, не могуць наглядна выпукліць цэнтральнае, галоўнае, вылучыць яго з агульнага.

Немалую практыку ў напісанні нарысаў мае М. Вішнеўскі. У часопісу за паўгоддзе надрукавана тры яго нарысы, з якіх самым лепшым трэба лічыць «Заўтрашні дзень» — аб калгасе «Рассвет» («Беларусь» № 6), самым слабым—нарыс «Аграном» (№ 4). Нарыс «Калгаснікі-ленінцы» (№ 1)—аб калгасе імя Леніна на Пружаншчыне—расцягнуты, без канкрэтных мастацкіх дэталяў, якія далі-б чытачу ўяўленне пра становішча спраў у калгасе.

З густам напісаны нарысы: Н. Туроўнікава—«У Бялыніцкага-Бірулі» (№ 2), Я. Садоўскага — «Палкаводзец Аляксандр Суворaў» (№ 5), М. Прышчэпава—«У нагу з відушчымі»—аб арцелі сляпых у Гомелі (№ 4).

Нарыс А. Матусевіча «Дарогамі жыцця» (№ 2)—аб адным з калгасаў Клецкага раёна, Баранавіцкай вобласці, мог-бы быць значна лепшым, калі-б у ім было больш стараннага стаўлення да тэмы, — гэта значыць, каб быў аналіз жыцця калгаснай вёскі. А без гэтага нарыс атрымаўся негрунтоўным.

З мастацкай прозы за паўгоддзе надрукаваны апавяданні К. Папкоўскага—«Родная брыгада» (№ 2), М. Даніленкі — «Зяць» (№ 4), І. Грамовіча—«Дзе цёплыя воды» (№ 5), А. Кулакоўскага—«Першы малюнак» (№ 5) і іншыя. Найлепшым з памянёных твораў трэба лічыць апавяданне для дзяцей А. Кулакоўскага—«Першы малюнак», напісанае з любоўю, з веданнем дзіцячай псіхалогіі, з мастацкім пачуццём меры. Апавяданне М. Даніленкі «Зяць» рыхлае, слаба акрэсленае сюжэтна. Даніленку трэба вучыцца будаваць сюжэт. Нельга-ж яго будаваць так, каб пабочныя матывы заглушылі асноўны, як гэта маем у апавяданні «Зяць». Прачытаўшы твор, цяжка зразумець, што ўрэшце думаў сказаць аўтар? Дзядзька Міхай, калгасны вартаўнік, не хацеў выдаваць сваю дачку Алену замуж за матроса Ігната, які вярнуўся з фронта, бо лічыў яго не вартым дачкі. Але пасля згадзіўся, бо пераканаўся ў сваёй памылцы. Гэта — галоўная вось апавядання. І трэба было на гэтым канфлікце вытрымаць апавяданне да канца. Аднак канфлікт так хутка і непрыкметна «растаў», што ад апавядання засталося нагрмаджэнне пабочных з'яў, не ўвязаных з галоўным матывам (Міхай—Ігнат). Словам, апавяданне распалася.

Апавяданне І. Грамовіча «Дзе цёплыя воды...», у якім рэльефна выпісаны вобразы Анатоля Панізовіча—маладога электрыка і старога інжынера Субоцкага, на нашу думку, па свайму сюжэту не выяснена да канца. Які вывад з усяго сказанага ў апавяданні трэба зрабіць чытачу—невядома — пратэставаць супроць адпачынку, ці адстойваць яго, ці адпачынак не павінен засланяць сабой думак і клопатаў аб сваёй працы, прафесіі, аб сваіх планах на будучыню. Словам, пры ўсёй мастацкасці апавядання не праяснены канфлікт.

Апавяданне «Дзе цёплыя воды» само па сабе цікавае, але нас не задавальняе яго канцоўка. Здаецца, што канец, пададзены аўтарам, нелагічны—ён супярэчыць ходу твора. Апавяданне К. Папкоўскага «Родная брыгада» слабаватае, у ім несур'ёзны канфлікт. Такі канфлікт, што Мікола вельмі «казырыцца» сваёй брыгадай і выклікае насмешкі з боку дзяўчат другой брыгады, быў-бы апраўданым, калі-б быў пададзены ў жартаўліва-сатырычнай форме. А ён пададзены з прэтэнзіяй на сур'ёзнасць, і таму атрымалася карыкатурнасць, здрабненне канфлікту.

Па часопісу «Беларусь» можна сачыць за развіццём нашай паэзіі — настолькі многа месца адводзіць часопіс паэтам старэйшым, маладым і пачынаючым. Гэта—вельмі прыемная з'ява. Ды іначай і не можа і не павінна быць. З усіх нашых часопісаў «Беларусь» найбольш аддаваў і аддае ўвагі выхаванню маладых. За паўгоддзе ў часопісу надрукавана шмат вершаў. Ёсць сярод іх вершы выдатныя, ёсць і слабейшыя.

Добрае ўражанне пакідаюць вершы М. Танка «У адной калоне», «Іх не вярнулі» («Беларусь» № 2), «Ірынка», «След лыжаў у Татрах» (№ 4). Напісаны яны свежа, арыгінальна, па-майстэрску. Па пабудове сюжэта вылучаюцца «У адной калоне», «След лыжаў у Татрах», па лірычнасці—«Іх не вярнулі», па пяшчотнасці—«Ірынка», па пачуцці хараства—«Дарога на возера Рыцу» (№ 1).

З вершаў М. Танка на калгасную тэматыку, на нашу думку, заслугоўвае ўвагі па сур'ёзнасці падыходу да тэмы верш «Першыя барозны», у якім адчуваецца ўплыў матываў Янкі Купалы з яго выдатнай паэмы «Яна і я». У вершах-жа вясельных, застольных, карагодных Танк нова не сказаў. Гэтыя вершы нічога не дадаюць да таго, што сказана паэтам раней у яго паэзіі. Мы маем на ўвазе вершы: «У вясенні дзень», «Калгасныя дажынкі» («Беларусь» №4), «Новы вырай» (№ 5). Верш «Табе складаю гэты гімн» добры па шуканню новых матываў.

З «іранскіх» вершаў Пімена Панчанкі, на нашу думку, найлепшы «Астра». З двух вершаў, прысвечаных Маякоўскаму («Беларусь» № 4), першы адзначаецца арыгінальнасцю, кандэнсацыяй думкі, майстэрствам пабудовы, другі—«Калі я заходжу ў мятро»—прыгожы па пабудове сюжэта.

З маладых паэтаў значнае месца занялі ў часопісу С. Гаўрусёў, П. Пранузa і Н. Тарас. Прыкметны рост у С. Гаўрусёва. Надрукавана ў часопісу за паўгоддзе сем яго вершаў. Лепшая адзнака яго вершаў—імкненне да абагульнення, а гэта—зарука росту паэта. У П. Пранузы мы прачыталі добры верш «Салдаты міру». Вершы Ніны Тарас усё больш і больш набываюць грамадскае гучанне, прыкметна ўпартая праца паэтэсы над формай (вершы «Я з захапленнем на прастор гляджу», «Праца», «У калгасным полі»). З'явіліся ў часопісу і новыя імёны—Барыс Лунькоў, А. Азерская, Н. Парукаў.

З крытычных артыкулаў і рэцэнзій, апрача работ У. Агіевіча аб Маякоўскім (№ 4) і Ю. Пшыркова, звяртаюць на сябе ўвагу рэцэнзіі Якуба Усікава (рэцэнзіі: «Паэмы Антона Бялевіча»—№ 1, «Дарогаю росту»—аб зборніку вершаў К. Кірэенкі «Мая рэспубліка» — № 5).

У рэцэнзіі Ю. Пшыркова «Погляд у будучыню» (№ 3)—аб зборніку апавяданняў Ілы Гурскага «Зары насустрач» мы не згаджаемся з ацэнкай апавядання «Ганульчына гора». З усяго зборніка Гурскага самыя лепшыя апавяданні—гэта «Перад бурай», «Сымоніха» і трэцяе—«Ганульчына гора». Тыповае ў гэтым апавяданні не тое, што крытыкуе рэцэнзент—Яўхім не прычапіў ардэноў да гімнасцёркі, вярнуўшыся з фронта. Тыповае тут у паказе псіхалагічнага стану як самога Яўхіма, сціплага чалавека з народа, так—з другога боку—яго жонкі Ганулі, якая з радасцю чакала ўбачыць мужа ўзнагароджаным. У гэтым увесь мастацкі сэнс апавядання. І калі яна ўбачыла, што ў мужа на гімнасцёрцы няма ўзнагарод, задумалася, засумавала. І якой была радасць, калі муж надзеў гімнасцёрку з ардэнамі! Вось гэта і жыццёва, праўдзіва, тыпова.

Сярод іншых рэцэнзій удумлівасцю вылучаецца рэцэнзія А. Семяновіча—«Аповесці Якуба Коласа на рускай мове». У некаторых аўтараў рэцэнзій назіраецца абыякавасць да недахопаў у творах, баязлівасць назваць рэчы сваімі імёнамі (Р. Няхай, С. Майхровіч, Н. Гарулёў). Рэцэнзію М. Гамолкі (№ 3) на зборнік твораў П. Панчанкі «Прысяга» заглушае дэкларатыўны тон, няма аналізу твораў. Пазнавальнае значэнне мае артыкул Ул. Няфёда—«Да пытання аб вывучэнні гісторыі беларускага тэатра» («Беларусь» № 6). Ён напісаны з веданнем прадмета, з пафасам, заклікае да сапраўднага вывучэння гісторыі беларускага тэатра.

Абсяг тэматыкі часопіса «Беларусь» не малы, і зразумела, што рэдакцыі патрэбен прадуманы план, каб пра многае сказаць чытачу.

Па-першае, трэба палепшыць работу аддзела публіцыстыкі, узняць якасны ўзровень матэрыялаў. Тут у першую чаргу павінна заняць месца тэма барацьбы за мір.

Па-другое, у часопісу павінны знайсці сабе месца артыкулы аб дасягненнях розных галін навукі, артыкулы праблемнага характару. Пільная ўвага павінна быць нададзена папулярызацыі вынаходстваў у галіне тэхнікі, папулярызацыі аграбіялагічнай навукі (Дакучаеў, Ціміразеў, Вільямс, Мічурын, Лысенка), прымяненню яе на практыцы на нашых вопытных палях, станцыях, інстытутах, на палях соўгасаў і калгасаў. Тэматыка змяшчаемых твораў павінна служыць распрацоўцы пытанняў, накіраваных на павышэнне ўраджайнасці на палях рэспублікі. Сюды павінны ўвайсці лясная гаспадарка, праблема асваення Палескай нізіны, тэмы па краязнаўству і інш.

Па-трэцяе, часопісу трэба друкаваць артыкулы і даведкі па гісторыі нашай рэспублікі, па гісторыі літаратуры, мастацтва, па мовазнаўству, археалогіі і інш.

Па-чацвертае побач з паэзіяй і мастацкай прозай трэба актывізаваць на старонках часопіса літаратурную крытыку, узнімаць яе на прынцыповы ўзровень.

Часопіс «Беларусь» нямала зрабіў у справе папулярызацыі лепшых твораў беларускай літаратуры. Перад рэдакцыяй стаіць задача—павышаць якасць друкуемых твораў.

„ПОЛЫМЯ“ № 7

Вышаў сёмы, ліпеньскі нумар часопіса «Полымя». Нумар адкрываецца геніяльнымі артыкуламі таварыша І. В. Сталіна «Адносна марксізма ў мовазнаўстве» і «Да некаторых пытанняў мовазнаўства».

Часопіс друкуе заканчэнне першай кнігі рамана Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах».

Беднай з'яўляецца ў нумары паэзія, прадстаўленая вершамі толькі двух паэтаў — Аляксея Зарыцкага («Магутны паток», «Інжынерскі дыплом», «Сын») і Рыгора Няхая («Вялікі мой і ціхі акіян», «Дзень», «Маладому будаўніку трактараграда»).

У часопісу змешчана камедыя Ілы Гурскага «Свае людзі».

Ніколькі не паляпшаецца ў часопісу справа з крытыкай і бібліяграфіяй. У апошнім нумары наогул змешчана толькі адна рэцэнзія — С. Майхровіча «Каштоўны ўклад у гісторыю партызанскай вайны беларускага народа» — пра кнігу Л. Цанавы «Усенародная партызанская вайна ў Беларусі супроць фашысцкіх захопнікаў». Паранейшаму часопіс вельмі мала друкуе артыкулаў і рэцэнзій аб творах беларускай літаратуры, не кажучы ўжо пра артыкулы праблемнага характару.

Па слядах нашых выступленняў

„За творчае развіццё совецкага мовазнаўства“

Партыйнае бюро Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна абмеркавала артыкул «За творчае развіццё совецкага мовазнаўства» і лічыць, што артыкул у асноўным правільна ўскрывае недахопы ў падрыхтоўцы і правядзенні паседжання Вучонага совета універсітэта па пытанню — «Аб артыкуле таварыша Сталіна «Адносна марксізма ў мовазнаўстве».

Партыйнае бюро рашыла ў верасні г. г. правесці паседжанне Вучонага совета па пытанню — аб перабудове выкладання мовазнаўства ва універсітэце ў святле артыкулаў таварыша Сталіна па пытаннях совецкага мовазнаўства.

Н. АРЛОЎ,
сакратар партбюро Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна.

Кіноабслугоўванне калгасаў

У час уборкі ўраджаю і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў Мінскае абласное Кіраўніцтва кінофікацыі ўзмацніла кіноабслугоўванне калгаснікаў. У мінулым месяцы ў калгасах вобласці дадзена 1843 кіносеансы, якія наведала 99100 сельскіх гледачоў. За гэты час дэманстраваліся многія кінофільмы на сельскагаспадарчыя тэмы: «Загадка росту», «Травапольныя севазвароты», «Гутарка агранома», «За высокі ўраджай ільну» і інш.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца кінофільмы «Кубанскія казакі», «Змова асуджаных», «У іх ёсць Радзіма», «Сельская настаўніца», «Аляксандр Папоў», «Трактарысты», «Сустрэча на Эльбе», «Падзенне Бярліна» і інш.

Барысаўскі райком КП(б)Б разам з раённым аддзелам кінофікацыі арганізаваў спецыяльна маршрутную агітмашыну, на якой устаноўлена кіноперасоўка. Гэтая машына наведала амаль усе сельскія советы раёна. Перад пачаткам сеансаў выступалі лектары з дакладамі аб міжнародным становішчы.

Дубліраванне кінофільмаў

Кіностудыя «Беларусьфільм» дубліравала на беларускую мову фільм «Змова асуджаных». У дубляжы прынялі ўдзел артысты Г. Глебаў, Б. Платонаў, Л. Рахленка, Л. Ржэцкая і іншыя.

Цяпер кіностудыя рыхтуецца да дубляжу «Сакрэтнай місіі».



Вокладкі новых кніг, выпушчаных Дзяржаўным выдавецтвам БССР.

Іван ГРАМОВІЧ

Першы раман маладога пісьменніка

Тэма партызанскай барацьбы беларускага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыцягнула да сябе ўвагу многіх нашых пісьменнікаў і яшчэ доўга будзе стаяць, як творчая задача, бо яна глыбокая і хвалюючая для Беларусі. У серыі твораў на гэту важную тэму раман Міколы Ткачова «Згуртаванасць» («Полымя» №№ 8, 9, 10, 11, 12 за 1949 год і № 5 за 1950 год) займае вартае месца.

Раман «Згуртаванасць» паказвае барацьбу і жыццё народных мсціўцаў аднаго раёна, які знаходзіўся ў тыле ворага, паказвае згуртаванасць совецкага народа вакол роднай большэвіцкай партыі. У агні суровага змагання гартаваліся людскія характары, іх непахісная ўпэўненасць і воля да перамогі. «Моцныя, вельмі моцныя мы. А чым? — піша ў пісьме галоўны герой рамана сакратар райкома партыі Кузьма Камлюк. — Згуртаванасцю сваёй, верай у перамогу». Калінаўшчына — гэта астравок совецкага жыцця, часова затопленага фашысцкай навалай, ён жыве жыццём сваёй вялікай маці-зямлі. Паранейшаму тут гаспадар— народ, і смела ездзіць па дарогах Кузьма Камлюк, а не фашысцкі камендант Рауберман са сваімі ўзброенымі сіламі і паліцыяй. Барацьба народных мсціўцаў у Калінаўскім раёне разгортваецца паступова, і пісьменнік пераканаўча паказвае, як яна распальваецца ў магутны агонь народнай помсты. Мікола Ткачоў праўдзіва і прыгожа малюе сапраўдную чалавечую дружбу і ўзаемадапамогу нашых людзей, іх любоў і адданасць Радзіме.

Раман «Згуртаванасць» па свайму памеру — шырокае палатно. Ён складаецца з чатырох частак. Чытач знаёміцца з героямі ў вечар пад свята вялікага Кастрычніка ў 1941 годзе. У другой частцы мы бачым іх праз год. Трэцяя частка — лета 1943 года і ў чацвертай, завяршаючай частцы рамана, пад восень 1943 года, калі фронт набліжаецца да Беларусі, баі ідуць у Бранскіх лясах, а грукат гармат разлягаецца па камяністых кручах Сожа, дзе жывуць і змагаюцца партызаны, дзе яны з дапамогай войск Совецкай Арміі здабываюць сабе вызваленне. Такі час ахоплівае раман «Згуртаванасць».

Мікола Ткачоў стварыў цэлую групу жыццёвых, удалых вобразаў, якія падабаюцца чытачу. Тут, у першую чаргу, прыгадваюцца Кузьма Камлюк, Барыс Злобіч, Надзя Забеліч, Паддубны, камісар Новікаў.

Вобраз Барыса Злобіча характэрны для ўсіх маладых людзей, вырасшых і выхаваных у даваенны час. Вайна парушыла мірнае творчае жыццё нашага народа, яна таксама абарвала і працу маладога настаўніка Злобіча. Ён бярэцца за зброю. У мінулым — студэнт інстытута, юнак цяпер праходзіць школу барацьбы з фашысцкімі акупантамі. Спачатку па даручэнню Кузьмы Камлюка ён стварае падпольныя групы, затым становіцца камандзірам партызанскай брыгады, якая наносіць смяртэльныя ўдары па ворагу. Ён узначальвае рашаючыя апярацыі партызан. Умела праведзеныя баі з паліцэйскім абозам, з Калінаўскім гарнізонам, арганізацыя і прарыў блакады паказваюць, як выявілася камандзірская здольнасць Барыса Злобіча, які авалодаў вайсковым майстэрствам. Праз увесь раман на вачах чытача ён пасталеў, узмужнеў, і чытач яго палюбіў, радуецца за яго баявыя поспехі. Аўтар паказвае, як Злобіч увесь час вучыцца ў старэйшага комуніста, сакратара райкома партыі Кузьмы Камлюка. Ён выконвае яго самыя адказныя заданні.

Надзя Забеліч кахае Барыса. Пісьменнік сумысля некалькі разоў падае сцэны яе чакання каханага пасля бою і гэтым самым падкрэслівае натуру, прывабнасць гэтай дзяўчыны. Яна падпольна прыносіць партызанам звесткі аб стане ворага. Ёй не лёгка пранікаць у гарнізон фашысцкіх войск, але для Надзі партызанскае заданне — найважнейшая справа, якая вышэй асабістых пачуццяў. Каханне Надзі да Барыса Злобіча не перашкаджае ёй, наадварот, яе любоў і адданасць Радзіме яшчэ больш падмацоўваюцца гарачым юнацкім пачуццём да камандзіра брыгады Злобіча, які таксама дужа кахае яе, і яны смела і дружна змагаюцца супроць акупантаў. Яны вераць у перамогу, бо змагаюцца за сваё шчаслівае жыццё. Чытач з цікавасцю сочыць за абодвума героямі.

У нашай прозе з кожным новым творам аб Айчыннай вайне ўсё паўней вырысоўваецца вобраз партыйнага кіраўніка. Міколу Ткачову ўдалося па-свойму жыццёва раскрыць вобраз комуніста Кузьмы Камлюка. Камлюк гаворыць заўсёды спакойна, стрымана, толькі ў асобныя моманты, калі хоча падкрэсліць якую-небудзь думку, павышае свой голас. Ён — як клапатлівы бацька і настаўнік для маладых. Недарэмна Барыс і Надзя лічаць сустрэчы і размовы з ім «своеасаблівай школай навучання і выхавання». Пісьменнік паказвае, як Камлюк узначальвае ўвесь партызанскі рух на Калінаўшчыне. Ён цэмянтуе народ вакол партыі большэвікоў, натхняе яго на перамогі і сам асабіста марыць пра час, калі возьмецца за аднаўленне і калінаўцы распрацуюць тыя багацці зямлі, якія ён прыкмеціў і вывучыў у раёне, ходзячы партызанскімі сцежкамі. І пара настае.

Камісар Мартын Новікаў — заўсёды стройны, акуратны, падцягнуты, ён— прыклад вайсковай арганізаванасці. Новікаў — чулы і сумленны таварыш у партызанскім быце і бясстрашны воін у бойцы. Мікола Ткачоў паказвае ў рамане, як Мартын Новікаў ваяваў у Беларусі і любіў яе так, як любіў усю Расію, як любіў усе рэспублікі і ўсе народы нашай Радзімы. Ён аддаў сваё жыццё, каб хутчэй наблізіць час вызвалення, час прыходу совецкіх войск. І не выпадкова, што пасля смерці камісара партызаны ўступаюць у партыю і абяцаюць над яго магілай змагацца так, як змагаўся Мартын Новікаў.

Цікавы вобраз Сяргея Паддубнага. Як камандзір, ён дапускае памылкі, не ўлічвае ў баю ўсёй важнасці ўзаемадзеяння з суседзямі. Сяргей усведамляе свае памылкі.

Пісьменнік праўдзіва малюе падзеі жыцця, і чытач захапляецца, даруе Сяргею Паддубнаму яго памылкі, бачачы, якая нястрымная помста кіруе юнаком у барацьбе.

Можна яшчэ прыгадаць партызанскага ўрача Рыгора Коўбеца, Струшня, бацьку Надзі Забеліч — вобразы, якія застаюцца ў памяці і добра ўдаліся ў рамане.

З захапленнем чытаеш пра будні партызанскага раёна. Лета 1943 года... Аснежаная дарога, па якой едуць Камлюк і Злобіч, правяраючы пасты партызанскіх дружын. Усё гэта выпісана цёпла, прыгожа і з'яўляецца, бадай, найлепшай мясцінай у творы. Пісьменнік зарэкамендаваў сябе, як майстра батальных сцэн. Апісанне бою надзвычай напружанае. Да чытача грукат бою даходзіць не праз успрыманне аднаго якога-небудзь героя, як гэта часамі сустракаецца ў нас (такі метад паказу, безумоўна, не заганны, але вузкі); у «Згуртаванасці» чытач адразу ўяўляе ўвесь вялікі малюнак бою і адначасова месца ў ім кожнага з герояў твора. Таму, нягледзячы на некаторую расцягненасць, у рамане па-майстэрску напісаны прарыў блакады, баі партызан з Калінаўскім гарнізонам, разгром паліцэйскага абозу.

Увогуле, прачытаўшы раман «Згуртаванасць», узнікае думка — пісьменнік ідзе ад жыцця. Ён узяўся за пяро пасля багатых жыццёвых назіранняў. У яго іх дастаткова і выдумляць нічога не трэба было. Аўтар глыбока адчувае сваіх герояў, а таму ён здолеў удала расказаць аб іх святочнай барацьбе, гераічных учынках, любві і дружбе.

Але неабходна зрабіць і дакор аўтару. Чаму пры чытанні ствараецца ўражанне, што ў рамане існуюць толькі сёлы Патравы, Нізкі і г. д., камсорг вёскі, партызанская дружына вёскі і г. д., а назвы калгасаў, якія, безумоўна, жылі поўнакроўным жыццём у раёне да прыходу фашыстаў, чытач не спаткае на працягу ўсяго рамана? Ды справа не ў назвах — у творы не паказана роля калгасаў у партызанскай зоне. Пачуццё грамадскага, калгаснага вораг не знішчыў у людзей, хоць і часова захапіў нашы калгасныя палеткі. Неўміручасць калгаснага ладу, пачуццё калектывізма аўтару трэба было намаляваць паўней і больш жыццёва. Гэта лінія ў творы вельмі слабая. Часамі нават станоўчыя героі (Злобіч) больш заклапочаны асабістымі, прыватнымі інтарэсамі, і іх грамадская роля ў творы блекне і слабее. Роля комсамольскай арганізацыі ва ўсенароднай барацьбе супроць гітлераўцаў таксама паказана слаба.

У канцы рамана аўтар прыдумаў некалькі прыгод Надзі Забеліч, асабліва там, дзе яна кідае Хвядоса Бошкіна ў калодзеж і вызваляе з-пад кратаў Паддубнага. Здаецца, што гэта не ў плане рэалістычнай тканіны твора і пададзена аўтарам толькі дзеля вастрыні і прыгодаў.

Рауберман паказаны лёгкадумным. Яго ўвесь час б'юць, паніжаюць у чынах, і такі вобраз некалькі прыніжаны ў параўнанні з тымі каварнымі і хітрымі забойцамі, якімі былі фашысты на нашай зямлі.

У рамане мы знаходзім трапныя дэталі. Але сустракаюцца і няўдалыя выразы, накшталт: «Словы незнаёмай чужой мовы, быццам нейкія бізуны, сцябалі па вушах людзей» і г. д.

Аўтар недастаткова працаваў над індывідуалізацыяй мовы герояў. Ёсць прамовы камандзіраў, у якіх адчуваецца характар героя, але такіх мала. Вось як таворыць Барыс Злобіч:

— Ах ты, антымістка саплівая (на сваю сястру).

Не верыцца, што мог так размаўляць Злобіч, былы выкладчык мовы.

Аўтар злоўжывае паасобнымі словамі, эпітэтамі: «каржакаваты», «таропка», «няўрымслівы», словам «іш» у сэнсе «бач». Гэтае «іш» паўтараюць розныя па характару людзі. Таксама сустракаецца каля 30 выпадкаў выслоўя «у-у-у». Рыгор Кобец: «У-у-у, якая радасць!»; Макар Аўдзеевіч: «У-у-у, замежны прыблуда»; Рауберман: «У-у-у, асцярожней біце». Гэтае выслоўе не ўпрыгожвае мову герояў і не перадае іх пачуццяў і думак.

Часамі аўтар адразу выдае свайго героя, таму чытачу не прыходзіцца разгадваць яго характар, мінулае, кім ён з'яўляецца і кім ён будзе (Касмач). Сюжэт рамана «Згуртаванасць» не дасканала пабудаваны. Сяго-таго многа ў творы, а сяго-таго нестае. Нестае скупасці, стройнасці, адшліфаванасці.

Над мовай аўтару патрэбна шмат працаваць. У ёй можна знайсці многа засмечанасці, безліч нехарактэрных для беларускай мовы зваротаў. Навошта пісаць «калясілі па свету», калі можна «блукалі па свеце». Аўтар піша: «На-тка, прыкурвай!», «Хадзі-тка, вунь на круглякі сядзем», «коні **развяцца-грэюцца** на бягу», «асколкі **пакавыралі** сцяну». У творы знаходзім словы, якія па свайму характару з'яўляюцца правінцыялізмамі. Замест вядомых у літаратурнай мове слоў пісьменнік ужывае: «месік», «упірлівая», «запатнелы». У адным месцы Мікола Ткачоў піша: «фырканне коней і **пакованне** снегу», а ў другім: «данеслася конскае тупанне і **пакованне** драбінак».

Засмечваюць мову рамана і словы жаргона. Прыкра, што яны сустракаюцца ў мове аўтара. Напрыклад: «слабінка», «накачкі», «Го, старыя яшчэ тыя». Часамі можна спаткаць непісьменна пабудаваныя сказы, напрыклад: «Ставячы на стол закусь, яна ўзвалілася на мужа».

Усе гэтыя моўныя хібы твора павінны былі згладзіцца пры рэдагаванні яго ў часопісу.

ГОРАД ЗАПАЛАНІЛА СТЫХІЯ ТАНЦАЎ

Цёплы сопечны дзень. У такі дзень хочацца адпачыць на вольным паветры, паслухаць змястоўную лекцыю, цікавы канцэрт, паглядзець новы кінофільм.

Нельга сказаць, што ў Бабруйску няма дзе культурна правесці свой час. Тут ёсць гарадскі парк, сады, у якіх многа зеляніны, добры тэатр, канцэртная заля, кінотэатры, клубы, стадыён, пляж.

На жаль, гарадскія арганізацыі мала клапоцяцца аб культурным адпачынку і мастацкім абслугоўванні жыхароў абласнога цэнтра.

Тое-сёе карыснае адбылося ў нядзелю 27 жніўня. У канцэртнай залі можна было паслухаць літаратурную кампазіцыю «Мальва» паводле М. Горкага. У гарадскіх кінотэатрах і ў клубах дэманстраваліся фільмы, а на стадыёне «Спартак» адбыўся футбольны матч паміж камандамі «Спартак (Бабруйск) і «Лакаматыў» (Жлобін), які закончыўся перамогай «Спартака» з лікам 2:0.

Але колькасць і якасць відовішчаў і іншых культурных мерапрыемстваў не могуць задаволіць бабруйчан.

Найбольш любімым месцам летняга адпачынку моладзі з'яўляецца гарадскі парк. Але гарадскі аддзел культасветработы і кіраўнікі парка (дырэктар тав. Мележ) вельмі мала зрабілі для ператварэння яго ў цэнтр культурнага адпачынку. Стыль работы кіраўніцтва парка пэўным чынам характарызуе выцвіўшая стандартная рэклама, якая нудна з дня ў дзень напамінае аб танцах, радыёле і кафе з «гарачым пітвом» і халоднымі закускамі. Парк дрэнна асвятляецца і наведвальнікі вымушаны блукаць па поўцёмных алеях. Няма ніякай нагляднай агітацыі. Адсутнічаюць стэнды і фотавітрыны стаханаўцаў прадпрыемстваў і майстроў высокіх ураджаяў, партрэтаў выдатных людзей краіны, дзеячоў навукі, культуры і мастацтва.

У парку няма ніякай нагляднай агітацыі на тэму барацьбы за мір. Не наладжваюцца літаратурныя вечары і канцэрты на гэтыя хвалюючыя тэмы. Цікавыя і змястоўныя лекцыі—рэдкая з'ява ў парку, а ў выходныя дні, калі збіраецца шмат наведвальнікаў, іх наогул не бывае. Не дзіўна, што ў будні дзень лекцыю на актуальную тэму «Марксізм-ленінізм аб рэлігіі» слухала не больш 50 чалавек.

Яшчэ больш рэдка арганізуюцца ў парку канцэрты, а ў выходныя дні за ўвесь жнівень адбыўся толькі адзін канцэрт так званай эстраднай брыгады пад кіраўніцтвам нейкага Сумарокава. З абурэннем успамінаюць наведвальнікі парка канцэрт п'яных хуліганаў Вараб'ёва і Самойлава, якія з эстрады зневажалі публіку нецэнзурнай лаянкай.

Не здолелі кіраўнікі культасветустаноў Бабруйска і абласны Дом народнай творчасці арганізаваць у парку выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці, расказы стаханаўцаў аб сваім вытворчым вопыце, сустрэчы з дзеячамі навукі, літаратуры і мастацтва, лекцыі аб дасягненнях эканомікі і культуры БССР.

Надзвычай бедная бібліятэка парка. Зусім адсутнічае ў ёй беларуская мастацкая літаратура.

Найбольш папулярная забава, якую прапануюць наведвальнікам,—гэта танцы, якія не абыходзяцца без пошлых факстротаў і чарльстонаў. Танцуюць не толькі ў парку, але і ў гарадскім тэатры, падлога якога забруджана акуркамі. Танцуюць і ў канцэртнай залі на Социялістычнай вуліцы. Стыхія танца захапіла работнікаў культурна-асветных устаноў, якія занядбалі карысныя мастацкія відовішчы.

Цэнтральны гарадскі парк не стаў цэнтрам карыснага культурнага адпачынку моладзі, а больш сталыя людзі зусім не наведваюць яго.

У гарадскім тэатры час-ад-часу наладжваюцца канцэрты розных вышадковых гастралёраў. Для «стылю» гэтых канцэртаў характэрна наступнае: У нядзелю 13-га жніўня ў тэатры выступала брыгада Белдзяржэстрады пад кіраўніцтвам А. Гусарава. Поруч з трукамі жанглёраў выконваліся скетчы «На прыёме», у якім у карыкатурным выглядзе паказаны совецкія людзі, і цыркавая пошлая сцэнка «У парку».

Яшчэ горшай была праграма канцэрта ў тэатры ў выходны дзень 20 жніўня. Пад выглядам філіяла Белдзяржцырка цэлы вечар «забаўляў» даверлівых гледачоў трансфарматар С. Чорны з двума памочнікамі. Праграма гэтага канцэрта была пустой, пазбаўленай зместу, а штукарства— старамодным і безгустоўным.

Мала парадавалі ў выходны дзень сваіх наведвальнікаў кінотэатры «Таварыш» і «Пролетары». У першым дэманстраваўся фільм «Жалезная маска», а ў другім— «Любімыя арыі». Старыя фільмы былі паказаны і ў клубах. Тут давялося сустрэцца нават з такімі назвамі, як замежны дэтэктыў «Таямнічы ўцякач».

Не скарыстоўваецца для спартыўных спаборніцтваў у выходны дзень і Беразіна. Некалькі старых малапрыгодных для гонак шлюпак на гарадской воднай станцыі— вось амаль увесь «інвентар».

У Бабруйску ўжо цэлы месяц амаль пустуе памяшканне гарадскога тэатра, дырэкцыя якога не дамаглася ад Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР прыезду тэатральнага калектыва. Даволі рэдкія госці тут і артысты філармоніі. Часцей прыязджаюць «эстрадныя брыгады», але, згодна заявы загадчыка абласнога аддзела мастацтва тав. Камарова і дырэктара парка тав. Мележа, гэтыя брыгады і калектывы не задавальняюць высокіх ідэйных і эстэтычных запатрабаванняў совецкага гледача.

Нездавальняючае культурнае абслугоўванне працоўных Бабруйска павінна быць карэнным чынам выпраўлена. Аб гэтым неабходна па-большэвіцку паклапаціцца Бабруйскаму гарадскому Совету дэпутатаў працоўных і Камітэту па справах культасветустаноў пры Совеце Міністраў БССР.

А. ІВАНОЎ,
(Наш спец. кар.).

г. Бабруйск.

Палымяны барацьбіт за мір

(15 год з дня смерці Анры Барбюса)

Памяць народаў беражліва захоўвае імёны людзей, якія аддалі сваё жыццё барацьбе за ўрачыстасць новых чалавечых адносін, святочнай барацьбе за мір і шчасце працоўных. Анры Барбюс стаіць у першым раду такіх барацьбітоў. Яго сапраўды гераічнае жыццё з'яўляецца выдатным узорам самаадданага служэння справе народа. Вялікі майстра мастацкага слова, гнеўны выкрывальнік капіталізма, пястомны арганізатар адзінага фронта барацьбы супроць фашызма і імперыялістычных войн, верны друг Совецкага Саюза — такім мы ведаем Барбюса. «Імя Барбюса,— сказаў Георгі Дзімітраў, — будзе зіхацець вогненымі літарамі на сцягах мільёнаў, якія змагаюцца супроць старога свету — свету эксплаатацыі, рабства і грабежніцкіх войнаў».

20 гадоў аддзяляюць першую кнігу Барбюса «Плакальшчыцы» (1895 г.) ад рамана «Агонь» (1916 г.). Гэта былі гады напружаных творчых шуканняў пісьменніка. Першыя яго творы маюць сляды ўплыву дэкадэнцтва. Аднак прыкметная зацікаўленасць аўтара соцыяльнымі праблемамі, яго шчырае спачуванне пакутам народа вылучаюць і гэтыя раннія творы з агульнай масы дэкадэнцкай літаратуры, нягледзячы на абстрактны характар барбюсаўскай крытыкі капіталістычнай рэчаіснасці, нягледзячы на няздольнасць мастака ў гэты перыяд сваёй творчасці глыбока разабрацца ў навакольным свеце гвалту і маны і, самае галоўнае, вызначыць верны шлях барацьбы з соцыяльнай несправядлівасцю.

У 1914 годзе, у пачатку імперыялістычнай вайны, Барбюс ідзе дабраахвотнікам на фронт. Некалькі гадоў прабыў ён радавым салдатам на пярэднім краі. Змрочная карціна раскрылася перад мастаком. Бессэнсоўны, антынародны характар бойні, якую распачалі імперыялісты, прыкрываючыся ілжывымі лозунгамі «абароны бацькаўшчыны», стаў для яго зусім зразумелым. Пісьменнік убачыў сапраўдных ворагаў народа. І свядомая, мэтанакіраваная барацьба за справу простых людзей, супроць чорных сіл імперыялістычнай рэакцыі стала сцягам яго жыцця. У 1916 годзе выходзіць у свет раман Барбюса «Агонь» — гнеўны выкрывальны дакумент, які зрывае маскі з натхніцеляў імперыялістычнага разбою, мудрая і бязлітасная ў сваёй суровай праўдзе кніга. На лёсе салдат аднаго ўзвода пісьменнік-рэаліст здолеў паказаць сапраўдны твар крывепралітнай вайны, пакуты і няшчасце народных мас, паразітызм пануючых класаў. Прадажныя пісакі буржуазіі адкрылі люты паход супроць Барбюса. Яго абвінавачвалі ў скажэнні рэчаіснасці. Яго аблівалі брудам. Праўда, расказаная пісьменнікам, палохала гандляроў крывёю.

«Страшнай і радаснай кнігай» назваў «Агонь» Максім Горкі. У гэтых словах дадзена глыбокая ацэнка рамана. Так, гэтая сапраўды страшная кніга з'яўляецца разам з тым і радаснай, таму што пісьменнік убачыў правільны выхад з крывавай бойні. Гэты выхад — барацьба за ператварэнне вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую. І нездарма раман заканчваецца словамі аб тым, што «сонца ўсё-такі існуе». У гэтай аптымістычнай канцоўцы знайшоў сваё адлюстраванне складаны працэс ідэйнага станаўлення герояў рамана, росту іх самасвядомасці, іх уступлення на новы шлях — шлях рэвалюцыйнай барацьбы за мір, супроць улады капітала.

«Яго кніга, — пісаў Горкі аб рамане Барбюса ў 1935 годзе, — адна з першых, якія за пятнаццаць год працеразілі многія тысячы галоў, п'яных ад крыві, і антыфашысцкі рух, які ўсё больш шырока расце ў нашы дні, павінен прызнаць Барбюса адным з самых першых сваіх заснавальнікаў».

У наступным сваім рамане — «Яснасць» (1919 год) Барбюс працягвае распрацоўваць тэму «Агню». Герой рамана, дробны канторскі служачы Сімон Пален, спачатку чалавек далёкі ад палітыкі, паслухмяны і занядбаны ўсімі, прайшоўшы праз выпрабаванні вайны, становіцца дзеячом, змагаром. Толькі актыўная, бясстрашная барацьба з капіталам, прыходзіць да выраду Пален, толькі рэвалюцыйная перабудова грамадства можа прынесці сапраўдную свабоду і шчасце людзям працы.

Праўдзівы паказ Барбюсам росту рэвалюцыйных настрояў сярод шырокіх народных мас быў высока ацэнены В. І. Леніным. У артыкуле «Аб задачах III інтэрнацыянала» (1919 г.) ён пісаў:

«Адным з асабліва наглядных пацверджанняў усюды наглядаемай, масавай з'явы росту рэвалюцыйнай свядомасці ў масах можна прызнаць раманы Анры Барбюса «У агні» і «Яснасць». Першы перакладзены ўжо на ўсе мовы і распаўсюджаны ў Францыі ў ліку 230 тысяч экземпляраў. Ператварэнне зусім цёмнага, цалкам падаўленага ідэямі і забабонамі, абываталя і масавіка ў рэвалюцыянера іменна пад уплывам вайны паказана незвычайна моцна, таленавіта, праўдзіва».

Пасля заканчэння сусветнай вайны Барбюс поўнасцю аддаецца справе згуртавання прагрэсіўных сіл еўрапейскай інтэлігенцыі да барацьбы супроць імперыялістычнай рэакцыі. Створаная ім група «Кляртэ», а таксама «Таварыства былых франтавікоў» адыгралі станоўчую ролю ў выкрыцці агрэсіўнай буржуазнай палітыкі, у абароне міру і бяспекі народаў. Калі-ж адбылася Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя, Барбюс горача вітаў яе і ўзняў свой голас у абарону совецкай рэспублікі.

У кастрычніку 1919 года, калі народы нашай краіны адбівалі згрэі інтэрвентаў, у газеце «Юманітэ» быў апублікаваны артыкул Барбюса «Мы абвінавачваем». І цяпер нельга без глыбокага хвалявання чытаць гэтыя смелыя, палымяныя радкі. Барбюс выразна бачыў светлую будучыню, якую адкрывала перад усім светам маладая совецкая рэспубліка. З гневам бічаваў ён патхніцеляў інтэрвенцыі, заклікаючы ўсіх сумленных людзей стаць на абарону працоўнага народа совецкай краіны: «Выратуйце чалавечую праўду, выратоўваючы праўду рускую! Ведайце, што наступныя пакаленні будуць меркаваць аб сумленнасці людзей нашага часу ў залежнасці ад таго, ці здолелі яны ўзняцца ў гэты момант, каб пракрычаць: «Не!».

Вынікам вялікай і шматбаковай палітычнай дзейнасці Барбюса ў перыяд 1917—20 гг. з'явіўся зборнік яго артыкулаў і прамоў «Словы барацьбіта». Крытыкуючы капіталістычную сістэму, як «варварства, якое пануе ва ўсіх напрамках», Барбюс бачыць адзіны выхад у рэвалюцыі. «Трэба імкнуцца да рэвалюцыі, таму што яна — шчасце». З радасцю гаворыць ён пра абуджэнне народных мас ва ўсім свеце, пра непераможнасць дэмакратычнага лагеру. І як вялікі прыклад, які нараджае пачуццё ўпэўненасці ва ўрачыстасць вызваленчай барацьбы народаў, паўстае перад пісьменнікам-трыбунам Совецкі Саюз. У баявым чырвоным сцягу Кастрычніцкай рэвалюцыі бачыць ён сцяг перамогі ўсяго працоўнага чалавецтва. Барбюс непарыўна звязаў свой лёс з лёсам рабочага класа. У 1923 годзе ён стаў комуністам.

Выключна вялікая роля Барбюса ў стварэнні антыфашысцкага народнага фронту. У 20-х і 30-х гадах ён разгарнуў кіпучую дзейнасць, накіраваную супроць фашызма, супроць новай вайны, якая рыхтавалася імперыялістамі. Арганізатар і ўдзельнік многіх антываенных кангрэсаў, з'ездаў, таварыстваў «Сяброў СССР» у розных краінах, Барбюс заўсёды падкрэсліваў, як важнейшую задачу сусветных антыфашысцкіх сіл, — абарону совецкай краіны, згуртаванне вакол вялікай соцыялістычнай дзяржавы, бачачы ў поспехах і росце нашай Радзімы заруку моцы і сілы лагеру дэмакратыі і міру. «Вайна зноў ідзе, — пісаў ён у 1932 годзе, — гэта трэба бачыць, нягледзячы на шоры, якія надзяваюць на вашы вочы. Совецкі Саюз ідзе наперад, прасякнуты ўсведамленнем велічы сваёй справы... Мы павінны палымяна абараняць гэтую справу, якая нас непасрэдна закранае ў любым кутку свету, якая закранае нас усіх, нашы сэрцы, нашы целы». І ён з найвялікшай палымянасцю народнага трыбуна адстайваў гэтую справу. Яго артыкулы і прамовы выкрывалі агідную хлусню буржуазнай прэсы аб Совецкім Саюзе. Калі ў 1933 годзе белагвардзеец Гаргулаў забіў французскага прэзідэнта Думера з мэтай справацыраваць вайну паміж Францыяй і СССР і прадажныя пісакі ўзнялі дзікае выццё аб тым, што Гаргулаў нібыта быў «большэвіком», Барбюс выступіў з грозным выкрыццём гэтай хлусні. У артыкуле «Я абвінавачваю», які заснаваны на неабвержных дакументах, ён паказаў, як французскі ўрад на працягу многіх гадоў падтрымліваў шматлікія белагвардзейскія арганізацыі ў Францыі, арганізацыі злачынцаў, што рыхтавалі новую вайну.

Не было ні адной важнай падзеі ў міжнародным жыцці, на якую не адгукнуўся-б гэты чалавек, што пасіў у сваім сэрцы нязгаснае полымя нянавісці да занявольнікаў народаў. Нязломнай мужнасцю адзначаны кожны яго крок. Ён гаварыў: «Няма на свеце доваду, які прымусіў-бы спыніцца, хоць-бы часова, на тым шляху, дзе розум і сэрца крычаць нам: «Наперад!».

Як баявая праграма, гучаць у нашы дні словы Барбюса, звернутыя да людзей добрай волі. Яны клічуць да актыўных дзеянняў у барацьбе за мір. З гневам выкрываў Барбюс тых «майстроў культуры», якія спрабавалі ўхіліцца ад удзелу ў вялікай бітве з сіламі рэакцыі, выбіралі ганебную пазіцыю неўмяшання. У бітве за мір не можа быць нейтральных, «залатая сярэдзіна, гэта — рэакцыя, якая хавае свой твар».

Барбюс часта наведваў Совецкі Саюз. Вялікі друг нашага народа, ён з захапленнем сачыў за гераічнай стваральнай работай працоўных краіны соцыялізма. Грандыёзная карціна будаўніцтва новага свету акрыляла Барбюса. Тут, у сям'і совецкіх народаў, бачыў ён жывое ўвасабленне самых высокіх ідэалаў працоўнага чалавецтва. І ён пісаў. Пісаў пра ўсё, што адкрывалася перад яго поглядам: пра выдатных людзей краіны Совецтаў, пра партыю, чыя мудрасць і воля накіравалі да вялікай мэты намаганні мільёнаў будаўнікоў соцыялізма, пра радасць жыцця, пра ўрачыстасць сід прагрэсу. Кнігі Барбюса «Расія», «Вось што зроблена ў Грузіі», шматлікія артыкулы расказвалі ўсяму свету светлую праўду аб нашай краіне.

У 1935 годзе пісьменнік закончыў працу над кнігай, якая з'явілася творчым вынікам яго жыцця, жыцця барацьбіта. Гэта была кніга аб Сталіне, аб вялікім чалавеку, «праз якога раскрываецца новы свет». У гэтай кнізе, вядомай цяпер ва ўсіх кутках зямлі, пісьменнік стварыў выдатны вобраз правадыра совецкага народа, друга і настаўніка ўсіх прыгнечаных, мудрага зодчага комунізма, вялікага сцяганосца міру. Барбюс працаваў над гэтым творам у гады, калі над светам збіраліся ўжо хмары новай вайны. І пісьменнік выказаў у сваёй кнізе пачуцці і думкі сотень мільёнаў простых людзей: справядлівая справа народаў, справа дэмакратыі і міру непераможны, таму што непераможны сілы прагрэса, якія ўзначальвае Сталін.

Кніга аб Сталіне — гэта яркі расказ аб совецкім народзе, аб будаўніцтве соцыялізма ў нашай краіне, аб увасабленні ў жыцці вялікіх ленінскіх запаветаў.

«Ленін жыве ўсюды, дзе ёсць рэвалюцыянеры. Але можна сказаць: ні ў кім так не ўвасоблены думка і слова Леніна, як у Сталіне. Сталін — гэта Ленін сёння».

Непахіснага барацьбіта за шчасце народаў ушаноўваем мы ў асобе Анры Барбюса. Як жывы сучаснік, як друг і брат наш, як удзельнік магутнага руху прыхільнікаў міру, уваходзіць ён у нашу эпоху. Справа, якой аддаў сваё жыццё гэты натхнёны змагар, жыве, памнажаюцца рады вялікай арміі свабодалюбівых народаў, поўных рашучасці сарваць крывавыя планы англа-амерыканскіх падпальшчыкаў вайны. Палымянае слова пісьменніка-комуніста Анры Барбюса — наша баявая зброя.

«Няхай яго жыццё, яго барацьба, яго спадзяванні і перспяктывы, — пісаў таварыш Сталін, — паслужаць прыкладам для маладога пакалення працоўных усіх краін у справе барацьбы за вызваленне чалавецтва ад капіталістычнага рабства».

Юр. ВАСІЛЬЕЎ.

ЗАПОЛЬСКІЯ ПЕСНЯРЫ

Ведае Нёман наш гора былое,
Слёзы людскія, праклён рыбака;
Песні гаротныя,
Скаргі народныя,
Панскі прыгнёт помніць Нёман-рака.
(З запольскіх песень).

Нёман — адна з найбольш любімых беларускім народам рэк.

Многа складзена песень, многа лягенд жыве ў народзе аб Нёмане, гэтым адвечным шляху сплаўшчыкаў і рыбакоў...

А трошкі паўднёвей, амаль паралельна яму, бяжыць звілістая дарога. Праз лугавую даліну ракі Сервеч дарога ідзе на ўсход.

І вось тут, на ўсходняй ускраіне ўраджайных карэліцкіх палёў, раскінулася сяло Заполле, а поруч з ім — вёскі Лясок і Краснае.

У 1926 годзе ў Заполлі быў заснаваны старэйшы ў Баранавіцкай вобласці народны хор.

У першыя гады свайго існавання гэта быў вакальна-драматычны гурток, які аб'ядноўваў у розны час ад 14 да 25 выканаўцаў. Кіраваў ім таленавіты запольскі пясняр Іван Тарасевіч. У рэпертуары хора пераважалі беларускія народныя песні і сярод іх было некалькі песень аб Нёмане. Трывалыя традыцыі мелі ў Заполлі і рускія рэвалюцыйныя песні, распаўсюджванню якіх спрыяла ў пачатку 900-х гадоў дзейнасць актыўнага падпольшчыка Якава Бязмена. Гэтыя песні спяваў народ на масавых сходах і дэманстрацыях, якімі запольцы адгукнуліся на падзеі 1905 года.

Драматычны гурток, у якім ігралі тыя-ж удзельнікі хора, ставіў беларускія п'есы: «Раскіданае гняздо» і «Прымакі» Я. Купалы, «Пінская шляхта» Дуніна-Марцінкевіча і іншыя.

Збіраючыся на «вечарынках», пераважна ў дамах сваіх удзельнікаў, хор развучваў, акрамя старых, новыя рэвалюцыйныя песні, створаныя ў хоры або запазычаныя з другіх раёнаў Заходняй Беларусі: «Спіхні ты, змоўкні, песня пакуты», «Палітзняволеныя», «Песня аб Арцюху» і многія іншыя. З гэтым рэпертуарам гурток выступаў зімой у хатах, а летам у гумнах сваёй і суседніх вёсак.

Слава аб Запольскім хоры разнеслася па ўсёй Навагрудчыне, а разам з гэтым узмацнілася праследванне яго органамі польскай ахранкі. Насельніцтва Любчанскага, Мірскага, Навагрудскага і іншых раёнаў запрашала запольцаў на канцэрты, і яны ніколі не адмаўляліся. Выручка ад платных канцэртаў перадавалася ў фонд дапамогі палітзняволеным. Пільна сачылі харысты за складам сваёй аудыторыі, таму што сярод слухачоў усё часцей можна было ўбачыць паліцэйскі мундзір або пераапранутага шпіка.

На каляды і вялікдзень групы харыстаў, апрануўшыся пад каляднікаў і валачобнікаў, выконвалі рэвалюцыйныя песні на мялодыі культавых песень:

Мае браты, ўжо час настаў,
Каб кожны з нас за праўду стаў...
Тады паўстане новы свет...
Даёш Совет!

Ніякая антысовецкая прапаганда, ніякі тэрор не маглі знішчыць гэтыя народныя імкненні да краіны Советаў. Цёмныя сілы рэакцыі не маглі засланіць свет з Усходу, заглушыць словы праўды, якія гучалі ў эфіры і перадаваліся з вуснаў у вусны. Гэтую праўду смела неслі ў масы запольскія спевакі.

У пачатку 30-х гадоў рэпертуар хора ўзбагаціўся совецкімі масавымі песнямі, якія прарываліся праз пасты і граніцы і атрымлівалі шырокае распаўсюджванне ў Заходняй Беларусі. «Марш комуністаў» Васільева-Буглая, «По долинам и по взгорьям» і іншыя совецкія песні гучалі на канцэртах Запольскага хора.

У 1932—1933 гадах чарговая хваля тэрора пракацілася ў Заходняй Беларусі. Пачаліся масавыя арышты, якія не абмінулі і запольцаў: за ўдзел у падпольнай комсамольскай арганізацыі былі арыштаваны і зняволены ўдзельнікі хора Зінаіда Шэўка і Грыгорый Шэйбак, а хору было забаронена выступаць.

Але тэрор не прымусіў харыстаў змоўкнуць. Паранейшаму, толькі яшчэ больш асцярожна, збіраліся харысты на рэпетыцыі то ў дамах удзельнікаў, то на беразе Нёмана або на астраўках сярод сітніку Сервецкай нізіны. І слухалі воды Нёмана і Сервечы новыя совецкія песні «Полюшко» Кніпера, «Марш вясёлых рэбят» Дунаеўскага, «Партызан Жалязняк» Блантэра. Спеўкі гэтыя часам увязваліся з комсамольскімі сходамі, і тады сюды акрамя харыстаў збіралася рэвалюцыйная моладзь з Шчэрсаў, Ерміч і іншых вёсак. Рэпетыцыі ў такіх выпадках ператвараліся ў своеасаблівыя канцэрты, у масавае развучванне навінак з Усходу і мясцовых рэвалюцыйных песень, сярод якіх асаблівай папулярнасцю карысталася песня «Дзе ў путах цемры нас трымалі, там ўзыйдзе зорка — алы цвет...».

Народ быў цвёрда ўпэўнены, што хутка павінен прыйсці канец няволі. У трывожныя летнія дні 1939 года ў Наднёманні з'явілася новая песня, якая канчалася словамі:

Яшчэ зіма трымацца хоча,
Віхурай снежнаю гудзе...
Але, як сонца пасля ночы,
Пасля зімы вясна прыдзе.
Вясна прыдзе!

Пасля ўз'яднання Запольскі гурток расце і няўхільна ўдасканальваецца. Свабодна гучаць у яго выкананні совецкія песні, у якіх выказваецца ўдзячнасць таварышу Сталіну за вызваленне з няволі.

Хор зноў пачаў сваю працу адразу пасля вайны, у 1945 годзе. Зноў запольцы сталі частымі і жаданымі гасцямі ў сельскіх клубах і хатах-чытальнях свайго і суседніх раёнаў. Паступова ў яго рады вяртаюцца былыя ўдзельнікі. У кіраўніцтве гуртком тав. Тарасевічу дапамагае Грыгоры Шэйбак, які правёў усю вайну на палях бітваў.

Пры хоры арганізоўваецца танцавальная група, якая добра зарэкамендавала сябе на абласным і рэспубліканскім аглядах у 1946 годзе. Аляксандр Моніч аднаўляе драматычны гурток. Але асаблівых поспехаў і імклівага мастацкага росту хор дасягнуў пасля прыходу да кіраўніцтва Пятра Шэўкі.

Калектыў Запольскага сельскага Дома культуры ў рэспубліканскім спаборніцтве гурткоў мастацкай самадзейнасці ў 1949 годзе заняў першае месца і атрымаў першую прэмію ў памеры 6 тысяч рублёў і Пераходны чырвоны сцяг Камітэта па справах культасветустаноў.

Частыя выступленні перад шматлікай народнай аудыторыяй зрабілі станоўчы ўплыў на рэпертуар хора: ён увесь час абнаўляецца і, перш за ўсё, за лік лепшых сучасных народных песень. Жыццё нашай краіны штодзённа падказвае новыя тэмы. Песні таленавітага самародка П. Шэўкі «Успаміны», «Калгасная полька» ўжо атрымалі вядомасць нават за межамі нашай вобласці.

Новыя песні расказваюць пра велізарныя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў заходніх абласцях рэспублікі. У іх адлюстраваны настроі шчаслівага совецкага Наднёмання:

Змоўкла над Нёманам песня пакуты,
Сёння аб шчасці пяе тут народ;
Песні вясёлыя,
Песні бадзёрыя
Льюцца свабодна над хвалямі вод.
(З запольскіх песень).

Г. ЦІТОВІЧ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Новыя кіночасопісы

Кіностудыя «Беларусьфільм» у жніўні выпусціла тры нумары часопісаў кінохронікі, якія прысвечаны барацьбе беларускіх хлебаробаў за высокі ўраджай і тэме міру.

У кіночасопісу № 23 (рэжысёр В. Стральцоў) глядач бачыць шырокія калгасныя прасторы Палесся, на якіх паспеў багаты ўраджай, даведваецца аб тым, як члены сельскагаспадарчых арцеляў «Совецкая Беларусь» і імя Калініна Хойніцкага раёна своечасова закончылі жніва, абмалот збожжа і датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па хлебапастаўках.

Цікавым з'яўляецца сюжэт аб тым, як сяляне заходніх абласцей будуюць новае калгаснае жыццё (кіночасопіс № 24).

У кіночасопісу № 25 расказваецца аб атрыманні ўрадавых узнагарод каучукаводамі калгаса «10 год БССР» Рудзенскага раёна.

У часопісу таксама змешчаны сюжэт «На вахце міру»—аб самаадданай стаханаўскай працы калектыва Гродзенскага тонкасуконнага камбіната.

Абласная выстаўка народнай творчасці

У віцебскім клубе сувязі адкрылася абласная выстаўка народнай творчасці. Тут экспануюцца карціны рабочага паравознага дэпо станцыі Віцебск Смірнова—«Разгром нямецкага штаба» і «Рыбакалгас».

Добрае ўражанне пакідае работа стаханаўца Белдрэса імя Сталіна Абраменкі—«Допыт Юрыя Смірнова».

Творчасць рабочага Віцебскага домабудаўнічага камбіната Гвоздзікава прадстаўлена карцінамі «Уручэнне пераходнага Чырвонага Сцягу», «Дзяўчынка ў хустачцы», «Дзядулькін мядаль».

Добра выкананы аршанскай хатняй гаспадыняй Івановай «Партрэт таварыша Сталіна» і «Нацюрморт» (мастацкая вышыўка).

Новыя кнігі

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі наступныя кнігі:

Рэдакцыя мастацкай літаратуры

Макар Паслядовіч. «Святло над Ліпскам». Раман. Мастак В. Гальцоў. Тыраж 10.000 экз., стар. 168. Цана 6 руб. 20 кап.

Рэдакцыя вучэбна-педагагічнай літаратуры

«Беларуская літаратура». Падручнік для VIII класа сярэдняй школы. Пад рэдакцыяй В. В. Барысенкі і М. Ц. Лынькова. Зацверджаны Міністэрствам асветы БССР. Выданне другое, выпраўленае.

В. Г. Караленка. «Сляпы музыка». (Эцюд). Пераклад Я. Шарахоўскага. Тыраж 20.000 экз., стар. 132. Цана 4 руб. 75 кап.

Рэдакцыя музычнай літаратуры

«Песні пра Сталіна». Для хора з ф-на. Тыраж 1000 экз., стар. 28. Цана 3 руб. 50 кап.

В. Алоўнікаў. «Песня аб Даватары». Для хора з ф-на. На рускай мове. Тыраж 300 экз., стар. 6. Цана 1 руб.

В. Алоўнікаў. «Мой мілы друг». Для барытона з ф-на. На рускай мове. Тыраж 300 экз., стар. 10. Цана 1 руб. 50 кап.

Старэйшы мастак-самавучка



* * *

На здымку: Л. Цыбулькін за работай над новай карцінай.

* * *

Магілёўскі абласны Дом народнай творчасці сумесна з абласным аддзелам мастацтва і грамадскасцю гор. Быхава 5-га кастрычніка г. г. адзначае 50-гoдзе творчай дзейнасці старэйшага майстра народнай творчасці, мастака-самавучкі тав. Цыбулькіна Аляксея Аляксандравіча.

Семнаццацігадовым юнаком па заданню настаўнікаў тав. Цыбулькін выконваў ілюстрацыі да твораў Пушкіна «Скупы рыцар» і «Русалка», да твораў Гогаля і інш.

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі і асабліва ў час арганізацыі калгасаў тав. Цыбулькін працаваў у пачатковай школе настаўнікам малявання, пісаў лозунгі, плакаты, афармляў дэкарацыі для гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Тав. Цыбулькін — неаднаразовы ўдзельнік раённых, абласных і ўсесаюзных выставак народнай творчасці.

У гэтым годзе на выстаўку, арганізаваную Магілёўскім абласным музеем, мастаком было прадстаўлена 36 работ, якія набыты музеем.

За 50-гадовую дзейнасць тав. Цыбулькін выканаў 250 работ акварэллю і 100 маслам.

Ва ўсіх яго работах шырока паказаны беларускі пяйзаж. Сярод іх: «Прырода Дняпра», «Веснавыя пяйзажы», «Беларускія вёскі», «Работа ў полі», «Рыбацкая арцель на Дняпры», «Вечар на калгасным полі», «Магіла партызана» і інш.

Г. МАРОЗАЎ.

г. Магілёў.

* * *

„Беларусь“ № 8

Жнівеньскі нумар часопіса «Беларусь» адкрываецца артыкулам І. В. Сталіна «Да некаторых пытанняў мовазнаўства. Адказ таварышу Е. Крашанінікавай».

Тэме барацьбы совецкіх людзей за мір ва ўсім свеце прысвечаны артыкулы «СССР — сцяганосец міру» Ф. Алешчука і «Совецкія пісьменнікі ў барацьбе за мір» Фёдара Гладкова. Акрамя гэтага, у часопісу надрукаваны артыкулы: «Далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў» І. Чарняўскага, «У небе Радзімы» Н. Паграбняка—пра дасягненні совецкіх авіятараў, «Высотныя будовы сталіцы» Д. Раманава—пра будаўніцтва універсітэта на Ленінскіх гарах і іншыя новыя архітэктурныя збудаванні Масквы, «Янка Купала і беларуская музыка» Б. Альховіч, «Юравіцкі хор» А. Есакова і інш.

Апавяданне «Жыта красуе» У. Краўчанкі прысвечана перадавым людзям калгаснай вёскі. Аўтар меў намер паказаць выдатную рысу совецкага чалавека—яго няспыннае імкненне наперад. Аднак апавяданне многа траціць з прычыны надуманасці сітуацыі, пры дапамозе якой пісьменнік раскрывае характары сваіх герояў.

Малады пісьменнік Іван Сіняўскі надрукаваў у часопісу апавяданне «Вераб'іная ноч». Аўтара патрэбна папярэдзіць ад сюжэтнага штампу, які пачынае заўважацца ў яго творах. Героямі апавядання «Вераб'іная ноч» з'яўляюцца два хлопчыкі—Валодзька і Міша, знаёмыя чытачу пад іншымі імёнамі па зборніку «У навальніцу».

Надыходзячая навальніца пагражае зацягнуць уборку жыта. Старшыня калгаса, які позна ўночы вярнуўся з раённага цэнтра, ударам у звон будзіць калгаснікаў. Яны дружна выходзяць у поле і пры дапамозе Валодзькі і Мішы паспяваюць усё сухое жыта звезці да дажджу ў гумны. У чытача ўзнікае законнае пытанне,—няўжо калгаснікі без дапамогі двух малышоў не змаглі-б справіцца з работай? У апавяданні ёсць па-мастацку зробленыя пяйзажныя малюнкі, добра перададзена напружанне калектыўнай працы, хвалюе непакой калгаснікаў за агульнае дабро.

Паэзія ў нумары прадстаўлена новай байкай Ул. Корбана «Зайздросная малпа», двума вершамі А. Русака — «Кланялася жыта» і «Песня» і вершам Н. Макаля «Паэт». Акрамя гэтага, у часопісу надрукаваны вершы украінскіх паэтаў Л. Первамайскага, А. Малышкі і Я. Шпорта ў перакладах К. Кірэенкі, А. Вялюгіна і М. Аўрамчыка.

Нарысы М. Ракітнага «Апавяданне брыгадзіра» і І. Турэцкага «Вялікая сіла» знаёмяць чытачоў з наватарамі сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Хацелася-б, каб аўтары больш паказалі духоўны свет сваіх герояў, іх характары. Нарыс «Жлобінскі птушкасоўгас» псуе неахайная мова. Вось як размаўляе з чытачамі яго аўтар С. Налібоцкі: «**Вытворчыя рамкі** соўгаса пакуль яшчэ не **дазваляюць перапрацаваць** унутры гаспадаркі **ўсе яйкі качак у жывую масу зялёных качанят**».

У раздзеле бібліяграфіі змешчаны рэцэнзіі: С. Майхровіча на зборнік «Слава дружбе» Ю. Рудзько, М. Гамолкі на кнігу вершаў Р. Сабаленкі «З родных крыніц» і М. Рыўкіна на зборнік К. Буйлы «Світанне». Калі рэцэнзіі С. Майхровіча і М. Гамолкі ў асноўным правільна вызначаюць ідэйнамастацкія якасці рэцэнзіруемых кніг, дык артыкул М. Рыўкіна з'яўляецца горшым узорам рэцэнзій, якія не даюць ніякага ўяўлення аб вартасці мастацкіх твораў. Артыкул механічна падзяляецца на дзве часткі. Спачатку аўтар разглядае тэматыку твораў К. Буйлы, змешчаных у зборніку «Світанне». Чытач даведваецца, што «паэтэса ўмее знаходзіць добрыя цёплыя словы» для выяўлення пачуццяў совецкага чалавека, што зборнік «яскрава сведчыць аб новых якасцях яе паэзіі, аб новым соцыяльным гучанні», што «вершы, прысвечаныя Беларусі, звычайна напісаны з вялікім унутраным пафасам і рамантычнай узнёсласцю». Затым, характарызуючы мастацкія сродкі паэтэсы, М. Рыўкін сцвярджае зусім адваротнае: «І ўсё-ж трэба сказаць, што пытанню мастацкіх якасцей верша, дасканаласці яго формы паэтэса ўдзяляе вельмі мала ўвагі. Яна не праяўляе асаблівых клопатаў аб стварэнні прыгожага, **прыемнага (?!)** па знешняй форме вершаванага радка». Такім чынам, тэзіс, які сцвярджаецца ў пачатку артыкула, аб тым, што паэзія Я. Купалы адыграла «выключную ролю ў справе фармавання яе (К. Буйлы) грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў» застаецца не раскрытым. Больш таго, чытач не ведае, якой часткі артыкула М. Рыўкіна верыць—першай ці другой.

Абмеркаванне новых твораў беларускіх драматургаў

У секцыі драматургаў ССПБ адбылася чытка і абмеркаванне новых твораў беларускіх пісьменнікаў.

У ліпені члены секцыі азнаёміліся і абмеркавалі п'есы Я. Садоўскага і Ул. Стальмаха «Калі ўзышло сонца» аб калектывізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі і новую п'есу А. Маўзона аб калгасным будаўніцтве.

30 жніўня драматург К. Губарэвіч прачытаў на сходзе секцыі сваю п'есу «Цытадэль славы»—аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

У бліжэйшы час на аб'яднаным сходзе драматургаў і артыстаў тэатра імя Я. Купалы будзе заслуханы даклад П. Глебкі на тэму «Аб культуры мовы ў тэатры імя Я. Купалы».

У верасні і кастрычніку будуць абмеркаваны спектаклі «Цытадэль славы» і «Пяюць жаваранкі».

Ю. НІКАЛАЕЎ

Дыскрымінацыя славян у ЗША

Уол-стрыт — галоўны дырыжор падпальшчыкаў вайны — паставіў перад амерыканскай рэакцыяй ганебную задачу распальвання нянавісці да славян. Гэта тлумачыцца тым, што славяне складаюць значную частку насельніцтва лагера міру і дэмакратыі і адыгрываюць вядучую ролю ў выкрыцці агрэсіўных планаў амерыканскіх імперыялістаў.

Рэакцыйны амерыканскі друк, пераймаючы найгоршыя метады хлуслівай гебельсаўскай прапаганды, распаўсюджвае паклёпніцкія выдумкі аб «адсталасці» славян, аб быццам-бы нізкім «культурным узроўні» славянскіх народаў, аб іх «няўменні карыстацца сучаснай тэхнікай» і г. д. А вядомы расіст, махровы рэакцыянер Дзюі, ідучы па слядах нюрэнбергскіх вісельнікаў, залічвае славян да «ніжэйшай» расы.

Разам з тым, амерыканская рэакцыя, імкнучыся зрабіць амерыканцаў «больш успрыймальнымі» да ваеннага псіхозу, усялякім чынам сее варожасць да славян, што жывуць у Злучаных Штатах Амерыкі. Гэта робіцца не толькі з мэтай распальвання варожасці да славянскіх народаў СССР і краін народнай дэмакратыі, але і з мэтай перашкодзіць умацаванню адзінства амерыканскіх славян з іншымі нацыянальнымі меншасцямі і групамі насельніцтва, адзінства, накіраванага на барацьбу за мір і за разгром фашызма ў ЗША.

Як вядома, у Злучаных Штатах пражывае звыш 10 мільёнаў славян; сярод іх ёсць значная колькасць рускіх, палякаў, чэхаў, славакаў, украінцаў, беларусаў, паўднёвых славян.

Дыскрымінацыя славян, у першую чаргу, выяўляецца ў розных абмежаваннях пры прыёме на работу, а таксама ў масавым звальненні рабочых славянскага паходжання і пазбаўлення іх палітычных правоў.

Амерыканскія рабочыя-славяне пераважна накіроўваюцца ў тыя галіны прамысловасці, дзе ўжываецца цяжкая фізічная праца, дзе яна аплачваецца ніжэй, чым у другіх галінах прамысловасці. Славян у ЗША можна сустрэць на чыгунках у якасці чорнарабочых, на бойнях, у рудніках, на металургічных заводах, на заводах па ачыстцы цукру і нафты, на лесапільнях і шклозаводах — амаль на ўсіх цяжкіх і шкодных для здароўя прадпрыемствах. У вугальнай, сталеплавільнай прамысловасці, напрыклад, славяне складаюць 51 процант рабочых. Многія славяне, апрача таго, жывуць у вялікай беднасці, працуючы на розных брудных выпадковых работах.

У сельскай гаспадарцы славяне выкарыстоўваюцца пераважна як сязонныя рабочыя на ўборцы бульбы, пшаніцы, цукровых буракоў і агародніны.

Рабочыя-славяне, як правіла, знаходзяцца ў цяжкіх бытавых умовах,—гэта, звычайна, жыхары самых бедных раёнаў і трушчоб. Асабліва адчувальна пагоршыліся ўмовы жыцця славян у Амерыцы цяпер, калі амерыканскія імперыялісты сталі на шлях агрэсіі і калі з кожным днём адчуваецца набліжэнне эканамічнага крызісу. Значную колькасць восемнаццацімільённай арміі беспрацоўных ЗША складаюць рабочыя славянскага паходжання.

Амерыканскі гісторык і сацыёлаг Джэром Дэвіс наведаў усе найбольш буйныя пасяленні рускіх у ЗША і звярнуўся да іх з пытаннем, як яны жывуць і якой думкі яны трымаюцца аб «амерыканскім ладзе жыцця». Вось што адказалі рускія рабочыя на пытанне гісторыка: «Рускі тут жыве, як дзікі звер або, як птушка ў клетцы... Усюды распальваюць нянавісць да нас. Дастаткова слова «рускі», каб... аказацца ў небяспецы». «Амерыканскае жыццё бессардэчнае», «Кожны дапамагае толькі самому сабе», «Тут няма спачування», «Амерыка — не свабодная краіна для рабочых: яны тут як скаціна, накшталт каня» і г. д. Так ахарактарызавалі рускія рабочыя «амерыканскі лад жыцця».

У такіх-жа ўмовах жывуць рабочыя і іншых славянскіх нацыянальнасцей.

Але амерыканцы славянскага паходжання актыўна выступаюць у перадавых радах прыхільнікаў міру. Амерыканскі славянскі кангрэс з'яўляецца адной з буйнейшых прагрэсіўных арганізацый у ЗША. У дні вайны ён з'яўляўся мабілізуючым цэнтрам славянскага насельніцтва ў барацьбе з фашысцкай Германіяй, а ў пасляваенны перыяд ён разам з другімі прагрэсіўнымі сіламі краіны абараняе справу міру, свабоды і дэмакратыі. Нацыянальны камітэт Амерыканскага славянскага кангрэса асудзіў Паўночна-атлантычны пакт, як пагрозу міру і бяспецы народаў.

Прагрэсіўная славянская грамадскасць ЗША прыняла ўдзел у рабоце Сусветнага Кангрэса прыхільнікаў міру ў Парыжы.

«Амерыканцы славянскага паходжання выступаюць супроць падпальшчыкаў вайны», — заявіў старшыня Славянскага кангрэса Кржыцкі на 4-м з'ездзе кангрэса ў Чыкага. У звароце да славянскіх народаў удзельнікі з'езда заявілі:

«Разам з усімі дэмакратычнымі сіламі Амерыкі мы будзем супраціўляцца планам новай вайны і фашызацыі Злучаных Штатаў... Мы не паддадзімся хлуслівай, ненавісніцкай ваеннай і антыславянскай прапагандзе...».

З'езд ухваліў таксама рэзалюцыю, у якой асуджаецца допуск у ЗША рэакцыйных элементаў з краін Усходняй Еўропы, асабліва цітаўскай агентуры, якая імкнецца ўнесці раскол у дэмакратычныя славянскія арганізацыі і паслабіць рады барацьбітоў за мір і дэмакратыю.

Славянскі кангрэс і іншыя арганізацыі, што належаць да яго, актыўна рэагуюць на ўсе антынародныя, агрэсіўныя мерапрыемствы ўрада ЗША. У сваёй самаахвярнай гераічнай барацьбе славяне ЗША паказалі сябе таксама гарачымі прыхільнікамі дружбы паміж амерыканскім народам і народамі Совецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі. Выкрываючы агрэсіўны характар пагроз з боку прэзідэнта ЗША Трумэна аб выкарыстанні атамнай зброі, сакратар Амерыканскага славянскага кангрэса пан Пірынскі заявіў, што Амерыканскі славянскі кангрэс разам з другімі прагрэсіўнымі арганізацыямі працоўных выступае за неадкладную забарону не толькі атамнай зброі, але і ўсіх іншых сродкаў масавага знішчэння людзей.

Амерыканскі ўрад скарыстоўвае ўсе магчымыя сродкі для ліквідацыі прагрэсіўных славянскіх арганізацый. Камісія па расследванню антыамерыканскай дзейнасці на закрытым паседжанні разглядала справу аб «падрыўной» рабоце Славянскага кангрэса, імкнучыся абвінаваціць яго, як «дыверсійную групу, якая імкнецца нанесці шкоду Злучаным Штатам Амерыкі».

У антыславянскім паходзе амерыканскай рэакцыі міністэрства юстыцыі ЗША пайшло яшчэ далей. Апрача славянскага кангрэса, да ліку «падрыўных» аднесена таксама газета «Народная воля», якая выходзіць у ЗША на балгарскай мове і якая праўдзіва асвятляе палітыку СССР і асуджае амерыканскіх дыпламатаў, што перашкаджаюць прыняццю Балгарыі ў члены ААН. Да ліку «падрыўных» аднесена і газета «Глос людовы» — орган польскай грамадскасці ў ЗША.

Пры ўмовах паліцэйскай амерыканскай дзяржавы славяне ў сучасны момант пераживаюць такія злосныя нападкі, якіх не перажывала, апрача неграў, ні адна другая частка насельніцтва ЗША. Рэакцыйны друк вядзе злосную кампанію за высылку з ЗША выдатных прагрэсіўных грамадскіх дзеячоў славянскага паходжання. Высылка пагражае, напрыклад, сакратару Амерыканскага славянскага кангрэса Пірынскаму. Сярод затрыманых міністэрствам юстыцыі 150 прагрэсіўных дзеячоў для высылкі з ЗША многа славян з Нью-Йорка, Пітсбурга, Дэтройта, Чыкага і іншых гарадоў.

Прагрэсіўныя грамадскія дзеячы-славяне жорстка праследуюцца. Так, вядомы прафесар Марсалка — удзельнік Сусветнага кангрэса прыхільнікаў міру зволены з Іельскага універсітэта. У горадзе Гэры рэакцыйныя элементы арганізавалі бандыцкі налёт на кватэру аднаго з кіраўнікоў мясцовай славянскай арганізацыі...

Праследуючы прагрэсіўных дзеячоў, амерыканская рэакцыя падтрымлівае ворагаў міру і дэмакратыі — белагвардзейскіх эмігрантаў і іншых здраднікаў народа. ЗША ператварыліся ў прытон усялякага рэакцыйнага зброду, выкінутага з краін народнай дэмакратыі. Усё гэта прадажнае ахвосце мае шырокую магчымасць распаўсюджваць самыя злосныя паклёпніцкія выдумкі супроць СССР і краін народнай дэмакратыі.

Нягледзячы на рэпрэсіі і праследванні, прагрэсіўнае славянскае насельніцтва ЗША разгортвае барацьбу з рэакцыяй, за свае грамадзянскія правы і свабоды, за мір, супроць падпальшчыкаў вайны. У лісце з канцэнтрацыйнага лагеру, які размяшчаецца каля статуі Свабоды, сакратар Амерыканскага славянскага кангрэса Пірынскі піша:

«Найвялікшы ўрок гісторыі, які паказвае, што прагрэсіўныя ідэі і рухі нельга забараніць за дротавай агарожай або спыніць шляхам судовых мерапрыемстваў і гвалту, зноў пацвярджаецца тут, у Амерыцы».

Ніякай жорсткасцю і праследваннямі не ўдасца амерыканскай імперыялістычнай рэакцыі запалохаць прагрэсіўных славян у ЗША, прымусіць іх адмовіцца ад барацьбы супроць фашызма, за мір і свабоду народаў.

У сучасны момант, калі імперыялісты ЗША прыступілі да ганебнай агрэсіі супроць свабодалюбівага карэйскага народа, прагрэсіўныя славяне ЗША разам з другімі дэмакратычнымі элементамі ўзмацняюць барацьбу супроць наступлення фашысцкай рэакцыі і распальвання ваеннай агрэсіі.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.

Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА — нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 00082. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэвалюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-04, аддзелаў літаратуры і мастацтва 2-14-94.